Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

# ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

СТУДЗЕНЬ 4 1934 г. ЧАЦВЕР № 3 (4836) Год выдання XVII

*Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!*

## ДА НОВЫХ ПЕРАМОГ!

Гомельская партыйная арганізацыя прыходзіць да сваёй партканферэнцыі і з'езда КП(б)Б з вялікімі дасягненнямі. Гэтыя дасягненні—рэзультат большэвіцкага кіраўніцтва ЦК КП(б)Б і т. ГІКАЛО, якія асаблівую ўвагу аддавалі гомельскай арганізацыі, як адной з буйнейшых арганізацый КП(б)Б.

Гомельская партыйная арганізацыя расла вельмі быстра. У гэтым росце партарганізацыі, як у люстэрку, адлюстрован рост Гомеля, як культурна-індустрыяльнага цэнтра. На росце Гомеля ярка відна перамога генеральнай лініі нашай партыі, перамога ленінскай нацыянальнай палітыкі.

Дробна-саматужны і дробна-гандлярскі гарадзішка ў мінулым стаўшым горадам з машынабудаўнічымі заводамі, лёгкай і хімічнай прамысловасцю. У Гомелі пятер 20.000 індустрыяльных рабочых. У Гомелі, дзе раней было ўсяго 300 вучняў школ, ёсць цяпер 87 сярэдніх школ, 5 інстытутаў, 10 тэхнікумаў, 3 рабфакі і навукова-даследчы інстытут. Да рэволюцыі ў Гомелі адпускалі на асвету 3.600 руб. У 1933 г. выдаткавана на асвету 3.937 тыс. руб.

Гэтыя лічбы гавораць аб грандыёзных перамогах, стаўшых магчымымі толькі дзякуючы дыктатуры пролетарыята.

Большэвікі Гомельшчыны на сваёй раённай партыйнай канферэнцыі падвялуць яркія вынікі, дасягнутыя ўпартай барацьбой і шматгаданай работай. Большэвікі Гомельшчыны, верныя да канца генеральнай лініі партыі, не раз паказвалі ўзоры непрымірымасці да апартунізма і непахіснасці ў барацьбе з класавым ворагам. Старыя традыцыі большэвікоў Палесся, якія змагаліся самаахвярна з царскімі апрычнікамі, з уплывам дробна-буржуазных і нацыяналістычных партый і груп на рабочых, з гонарам захоўваюцца большэвікамі новага пакалення. А гераічная барацьба гомельскіх комунараў з стракашытаўскімі мяцежнікамі? Хто з рабочых Гомеля не памятае гэтага яркага эпізода з гісторыі гомельскай партыйнай арганізацыі? Імёны загінуўшых большэвікоў—Ланге, Кагайская, Камісараў, Белецкі і інш.—гэта імёны герояў, памяць аб якіх з'яўляецца заклікам да барацьбы з усімі рэшткамі праклятага мінулага.

Гомельская партыйная арганізацыя высока трымае сцяг ленінізма. Пад гэтым сцягам яна наносіла сакрушальныя ўдары трацкісцкім групам, прабаваўшым у 1924-27 г. г. захапіць кіраўніцтва арганізацыяй у свае рукі, пад гэтым сцягам яна рашуча і бязлітасна біла і прадаўжае біць праяўлення апартунізма, нацыяналізма і т. д. І на сваю партыйную канферэнцыю гомельскія большэвікі прыходзяць яшчэ больш згуртаванымі вакол ленінскага сцяга, вакол ленінскага ЦК ВКП(б) і правадыра партыі т. **Сталіна.**

На раённай партыйнай канферэнцыі Гомельшчыны будуць падведзены вынікі і на аснове шырокай большэвіцкай самакрытыкі будуць адзначаны недахопы. А недахопы ў гомельскай партыйнай арганізацыі ёсць. Аб іх гавораць вынікі чысткі, аб іх гаворыць сёння ў нашай газеце сакратар гомельскага гаркома т. **Шафарэвіча.**

Адным з найбольш істотных недахопаў гомельскай партыйнай арганізацыі з'яўляецца адставанне раду фабрык і заводаў як па колькасных, так і па якасных паказальніках прамфінплана. Прычына адставання—слабасць аперацыйнага і канкрэтнага кіраўніцтва, слабасць барацьбы за арганізацыю вытворчасці. Таму на раённай партыйнай канферэнцыі павінна быць звернута асаблівая ўвага на тое, каб узняць арганізацыйную работу да ўзроўня палітычнага кіраўніцтва, каб замест «агульных», абстрактных дырэктыў кіраваць канкрэтна, вывучаючы дэталі справы.

У гомельскай партыйнай арганізацыі ёсць шмат вырасшых большэвіцкіх арганізатараў з радавой рабочай масы. Гэтыя новыя людзі, адданыя вялікай справе сацыялістычнага будаўніцтва, выяўлены і ў працэсе чысткі партыйнай арганізацыі і пастаўлены на кіруючыя пасты на фабрыках і заводах, у партыйных і прафсаюзных органах.

Вось што гаворыць сакратар парт'ячэйкі лінейнага цэха Гомельшляха тав. **БЕРНОВІЧ**: «Чыстка партыйнай арганізацыі выявіла многа сапраўдных барацьбітоў за план. Калі да чысткі брыгада абрубшчыкаў адставала, то зараз яна з'яўляецца адной з перадавых. Парторг тав. **Жэлезнякоў** здолеў забяспечыць авангардную ролю кому ністаў на вытворчасці. Вытворчая праграма перавыконваецца, брак даведзен да 0,16 проц. замест 5 проц., дапушчаных планам». Аб тым-жа расказваюць і другія сакратары цэх'ячэек, парторгі і майстры ў нашай газеце.

Усё гэта паказвае, што ёсць вялікія магчымасці для ліквідацыі адставання гомельскай прамысловасці, што ёсць яшчэ вялікія рэзервы большэвіцкіх арганізатараў, якім трэба толькі дапамагаць, якіх трэба вучыць і якімі трэба аперацыйна і канкрэтна кіраваць.

У Гомелі ёсць зусім новая прамысловасць з новай тэхнікай. Таму пытанне аб асваенні новай вытворчасці, аб аўладанні новай тэхнікай з'яўляецца рашаючым пытаннем і на яго павінна быць звернута асаблівая сур'ёзная ўвага партыйнай канферэнцыі.

Ёсць недахопы і ў галіне кіраўніцтва сельскай гаспадаркай. Аб гэтым гаворыць надзвычай павольны рост калектывізацыі па раёну. У той час, калі па рэспубліцы процант калектывізацыі складае 63, у Гомельскім раёне процант калектывізацыі дасягнуў усяго 32. Такі нізкі процант калектывізацыі з'яўляецца рэзультатам недастатковай работы па арганізацыйна - гаспадарчаму ўмацаванню калгасаў. Гэты прабел можа быць лёгка ліквідаваны, тым больш, што ў 1933 годзе Гомельскі раён не дрэнна закончыў сельгаспаботы. Замацаванне поспехаў прашоўшага сельска-гаспадарчага года, далейшая барацьба за ўмацаванне калгасаў і змоцненне жыццё калгаспікаў забяспечаць узмацненне роста калектывізацыі ў раёне.

Тэзісы ЦК ВКП(б) да XVII з'езда партыі ставяць новыя грандыёзныя задачы і намячаюць шляхі іх вырашэння. Тэзісы ўстанаўляюць новы стыль работы, адпавядаючы задачам другой пяцігодкі. Гэты новы стыль работы, далейшае разгортванне самакрытыкі, соцсаборніцтва, актыўнасці і самадзейнасці партыйных і беспартыйных мас з'яўляюцца рашаючымі ўмовамі нашых далейшых перамог.

Няма сумнення, што большэвікі Гомеля пасля партыйнай канферэнцыі, закасаўшы рукавы, з яшчэ большай энергіяй, з яшчэ большай самаадданасцю, узначальваючы шырокія масы беспартыйных, возьмуцца за работу па-новаму і, выпраўляючы ўсе свае недахопы і прабелы, яшчэ шырэй разгорнуць барацьбу за новыя і новыя перамогі.

Прывітанне большэвікам Гомельшчыны!

## ПАВЕДАМЛЕННЕ АБ XIII ПЛЕНУМЕ ВККІ

У СНЕЖНІ Ў МАСКВЕ АДБЫЎСЯ 13 ПЛЕНУМ ВЫКАНКОМА КОМУНІСТЫЧНАГА ІНТЭРНАЦЫЯНАЛА.

13 ПЛЕНУМ ВККІ ЗАСЛУХАЎ:

1. ДАКЛАД ТАВ. КУУСІНЕНА АБ ФАШЫЗМЕ. ВАЕННАЙ НЕБЯСПЕЦЫ І ЗАДАЧАХ КОМУНІСТЫЧНЫХ ПАРТЫЙ.

2. ДАКЛАДЫ ПАРТЫЙ:

а) ДАКЛАД ТАВ. ПІКА АБ ДЗЕЙНАСЦІ КОМУНІСТЫЧНАЙ ПАРТЫІ ГЕРМАНІІ;

б) ДАКЛАД ТАВ. ПОЛЛІТА АБ ТАКТЫЦЫ АДЗІНАГА ФРОНТА Ў АНГЛІІ.

ЗАСЛУХАЎШЫ ДАКЛАД ТАВ. КУУСІНЕНА І ДАКЛАДЫ Т. Т. ПІКА І ПОЛЛІТА, ПЛЕНУМ ПАСЛЯ ДЭТАЛЬНАГА АБМЕРКАВАННЯ ПРЫНЯЎ ТЭЗІСЫ АБ ФАШЫЗМЕ, НЕБЯСПЕЦЫ ВАЙНЫ І ЗАДАЧАХ КОМПАРТЫІ.

ПА ДАКЛАДУ ТАВ. ПІКА ПЛЕНУМ УХВАЛІЎ РАБОТУ КП ГЕРМАНІІ ПАСЛЯ ПРЫХОДА ФАШЫСТАЎ ДА ЎЛАДЫ І ПРАПАНАВАНЫ ЁЮ ПЛАН ДАЛЕЙШАЙ ДЗЕЙНАСЦІ.

ПА ДАКЛАДУ ПОЛЛІТА ПЛЕНУМ «КАНСТАТАВАЎ, ШТО КП АНГЛІІ ДАСЯГНУЛА НЕКАТОРЫХ ПОСПЕХАЎ У ГАЛІНЕ ПРАВЯДЗЕННЯ АДЗІНАГА ФРОНТА, АСАБЛІВА Ў АДНОСІНАХ НЕЗАЛЕЖНАЙ РАБОЧАЙ ПАРТЫІ. ПЛЕНУМ ПРАПАНАВАЎ КП АНГЛІІ ЎЗМАЦНІЦЬ БАРАЦЬБУ ЗА АДЗІНЫ ФРОНТ НА АСНОВЕ КАШКРЭТНЫХ ПАТРАБАВАННЯЎ, УЦЯГВАЮЧЫ Ў ЯГО РАБОЧЫХ, ЯКІЯ ІДУЦЬ ЯШЧЭ ЗА РАБОЧАЙ ПАРТЫЯЙ І ПРАФБЮРАКРАТАМІ, ВЫКРЫВАЮЧЫ ПРЫ ГЭТЫМ МАНЕЎРЫ ЛІДЭРАЎ РАБОЧАЙ ПАРТЫІ І НЕЗАЛЕЖНАЙ РАБОЧАЙ ПАРТЫІ.

3. ПА ТРЭЦЯМУ ПУНКТУ ПАРАДКА ДНЯ ПЛЕНУМ ПАСТАНАВІЎ СКЛІКАЦЬ VII КАНГРЭС КОМІНТЭРНА Ў ДРУГОЙ ПАЛОВЕ 1934 Г.

ПЛЕНУМ ПРАВЁЎ ДАДАТКОВЫЯ ВЫБАРЫ У ПРЭЗІДЫУМ І ЗАЦВЕРДЗІЎ ФІНАНСАВУЮ СПРАВАЗДАЧУ ВККІ.

ПЛЕНУМ ТАКСАМА ЗВЯРНУЎСЯ ДА РАБОЧЫХ УСІХ КРАІН З АДОЗВАЙ АБ БЕЛЫМ ТЭРОРЫ.

УСЕ ПАСТАНОВЫ ПЛЕНУМА БЫЛІ ПРЫНЯТЫ АДНАГАЛОСНА.

ТЭЗІСЫ І ПАСТАНОВЫ XIII ПЛЕНУМА ВККІ ПУБЛІКУЮЦЦА АДНАЧАСОВА З ДАНЫМ ПАВЕДАМЛЕННЕМ.

ПАЛІТСАКРАТАРЫЯТ ВККІ

## ПАСТАНОВА ПЛЕНУМА ВККІ аб СКЛІКАННІ VII КАНГРЭСА КІ

1. СКЛІКАЦЬ VII КАНГРЭС У ДРУГОЙ ПАЛОВЕ 1934 Г.

2. ДАРУЧЫЦЬ ПРЭЗІДЫУМУ ВККІ НЕ ПАЗНЕЙ ЧЭМ ЧЭРВЕНЯ АПУБЛІКАВАЦЬ ПАРАДАК ДНЯ, ПАЗНАЧЫЦЬ ДАКЛАДЧЫКАЎ ПА АСОБНЫХ ПЫТАННЯХ ПАРАДКА ДНЯ І ЎСТАНАВІЦЬ НОРМУ ПРАДСТАЎНІЦТВА АД АСОБНЫХ СЕКЦЫЙ КІ НА VII КАНГРЭСЕ.

3. АБАВЯЗАЦЬ СЕКЦЫІ КІ ЗАРАЗ-ЖА, ЯК ТОЛЬКІ БУДЗЕ АПУБЛІКОВАН ПАРАДАК ДНЯ, ПАЧАЦЬ ПАДРЫХТОЎКУ ВА ЎСІХ ПАРТЫЙНЫХ АРГАНІЗАЦЫЯХ ДА VII КАНГРЭСА КІ.

4. АБАВЯЗАЦЬ ЦЭНТРАЛЬНЫЯ КАМІТЭТЫ УСІХ КОМПАРТЫЙ ДА 1-ГА ЧЭРВЕНЯ ПАВЕДАМІЦЬ ПРЭЗІДУУМУ ВККІ СВАЕ ПРАПАНОВЫ АБ ПАРАДКУ ДНЯ КАНГРЭСА.

## ПЕРАДАВІКІ ГОМЕЛЬШЧЫНЫ

Гомельскі завод «Пролетарый» 25 снежня выканаў гадавую праграму на 102,9 проц. Сабекошт знізжан на 16,1 проц.

Гомель—ПАЛЕСДРУК 26 снежня выканаў гадавую праграму на 100.3 проц. Па прадукцыйнасці працы—на 101,5 проц. Сабекошт прадукцыі зніжан на 6 проц. Зарплата выдаткавана на 97,8 проц.

Вашебская АКУЛЯРНАЯ ФАБРЫКА 24 снежня выканала гадавы прамфінплан на 100,6 проц.

## Хімзавод выканаў гадавы план

Рабочы калектыў ХІМФАРМЗАВОДА датэрмінова выканаў прамфінплан першага года другой пяцігодкі.

29 снежня 1933 г., а 2-й гадзіне дня гадавы прамфінплан выкананы на 100,2 проц.

Рабочы калектыў ХІМФАРМЗАВОДА запэўняе партыю і ўрад, што і ў далейшым будзе з большэвіцкай настойлівасцю змагацца за тэмпы і якасць добраякаснай прадукцыі.

Дырэктар хімфармзавода **ЛІБМАН.**

Сакратар ячэйкі КП(б)Б **ВАСІЛЬЕЎ.**

Старшыня заўкома **ЗЛЬКІН.**

### СЕСІЯ ЦВК СССР

## ПРАМОВА тав. А. Г. ЧЭРВЯКОВА

— Таварышы, даклад старшыні СНК Саюза ССР тав. **Молатава** аб вынніках будаўніцтва за 1933 год гаворыць аб апрамадных дасягненнях Совецкага Саюза ва ўсіх галінах соцыялістычнага будаўніцтва, а таксама ў галіне міжнародных палітычных адносін. Рост Совецкага Саюза ў цэлым з'яўляецца ростам усіх частак Совецкага Саюза. Мне думаецца, што тав. **Калінін** невышадкова сваё ўступнае слова на сесіі ВЦВК прысвяціў галоўным чынам тым аграмадным поспехам, якія мае РСФСР у справе асваення і будаўніцтва самых аддаленых акраін РСФСР.

Я асабіста лічу сваім абавязкам кароткa спыніцца на тых аграмадных поспехах, якіх мы дасягнулі ў Беларускай Совецкай Соцыялістычнай Рэспубліцы. Гэта, мне думаецца, тым больш неабходна, што якраз сёння спаўняецца 15 год з дня ага лашэння Беларускай Совецкай Рэспублікі. Падводзячы вынікі за мінулы перыяд, мы хочам паказаць Совецкаму Саюзу і ўсяму свету, што тыя аграмадныя поспехі, якіх дабілася Совецкая Беларусь, сталі магчымымі толькі дзякуючы Окцябрскай рэволюцыі, толькі дзякуючы ўмацаванню ўлады Совецаў, толькі дзякуючы стварэнню Саюза Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік, як адзінай дзяржавы, арганічную і непарыўную частку якой складае БССР. **(Апладысменты).**

Беларусь у мінулым, з'яўляючыся часткай Расійскай імперыі складала так званы Паўночна-Заходні край, які вызначаў сабой вам усім вядомую ганебную рысу аседласці. Калі царская Расія ў цэлым з'яўлялася турмой народаў, то Паўночна-Заходні край з'яўляўся асобай рафінаванай часткай гэтай турмы, дзе прыгнечанае эканамічнае, палітычнае, культурнае, нацыянальнае было давядзена да сваёй крайняй ступені развіцця.

Пад непасрэдным пастаянным кіраўніцтвам ЦК нашай партыі, пры падтрымцы і дапамозе з боку Совецкага Саюза і яго рабоча-сялянска га ўрала, Совецкая Беларусь здолела пастаянцця з прыніжанага, прыгнечанага становішча на небывалую вышыню.

Беларусь у мінулым амаль не мела буйнай прамысловасці. У даны момант Беларусь мае дзесяткі буйнейшых прамысловых прадпрыемстваў, на якіх працуюць дзесяткі тысяч рабочых, новых пролетарыяў, вырасшых за час існавання ўлады Совецаў.

Валавая прадукцыя прамысловасці Совецкай Беларусі ў 1933 г. перавысіла даваенны ўзровень больш чым у дзесяць раз. Намі пабудован рад прамысловых прадпрыемстваў, якія маюць усесаюзнае значэнне. Калі яшчэ ў 1929 годзе рабочых у Беларусі было толькі 49 тыс., то ў 1932 годзе колькасць рабочых складала амаль 114 тыс. Гэты рост колькаснасці рабочых прадаўжаецца, бо будуюцца новыя заводы, пашыраюцца існуючыя. Растуць нацыянальныя кадры рабочых Совецкай Беларусі.

Гэта дае нам права заявіць, што Совецкая Беларусь разам з усім Совецкім Саюзам пры пастаянным і ўважлівым падтрымканні Совецкага Саюза ператвараецца ў краіну аграрна-прамысловую ў краіну індустрыяльна-аграрную.

Разам з Совецкім Саюзам мы змагаемся за соцыялістычную рэканструкцыю сельскай гаспадаркі. Совецкая Беларусь і ў гэтай барацьбе таксама мае аграмадныя поспехі і дасягненні.

Пасеўныя плошчы выраслі з 2.389 тыс. га ў 1916 г. да 3.710 тыс. га ў 1933 г. Змяняецца самы характар сельскай гаспадаркі, расце плошча, занятая тэхнічнымі культурамі. Плошчы пад бульбай павялічыліся з 459 тыс. у 1928 г. да 608 тыс. га ў гэтым годзе.

Плошча пад пасевам ільну павялічылася са 140 га ў 1928 г. да 232 тыс. га ў 1933 г.

Значна расце машынізацыя сельскай гаспадаркі, павялічваецца пры мяненне штучных угнаенняў і інш.

Асабліва вялізарны поспехі Совецкай Беларусі на фронце нацыянальна-культурнага будаўніцтва. Беларусь, у мінулым з'яўлялася адной з найбольш адсталых і некультурных частак царскай Расіі. Напярэдадні імперыялістычнай вайны граматныя ў Беларусі складалі толькі каля 30 проц. У даны момант непісьменнасць сярод дарослага насельніцтва г. асноўным канчаткова ліквідавана. Мы ажыццяўляем усеагульнае пачатковае навучанне ў горадзе на аснове сямігодкі і змагаемся за тое, каб ажыццявіць яго на базе дзесяцігодкі. У раёнах суцэльнай калектывізацыі ўсеагульнае абавязковае навучанне мы праводзім таксама на аснове сямігодкі. Мы развіваем гэту сетку сямігодкі ва ўсіх частках Совецкай Беларусі з тым, каб усеагульнае навучанне ў бліжэйшыя-ж гады было поўнасцю ажыццёўлена не толькі на базе чатырохгодкі, але і сямігодкі. Поспехі школьнага будаўніцтва трэба таксама адзначыць і тым, што мы забяспечылі ўсеагульнае навучанне на родной мове прапоўных Совецкай Беларусі. Нашы паказальнікі ў справе культурнага будаўніцтва не абмяжоўваюцца толькі пачатковай школай—сямі і дзесяцігодкай. Беларусь арганізавала Беларускую Акадэмію Навук, у 1933 годзе мае 19 вышэйшых навучальных устаноў. Мы маем 83 тэхнікумы, 35 рабфакаў, 76 фабзавучаў і рад курсаў, дзе ідзе падрыхтоўка чырвоных спецыялістаў усіх галін соцыялістычнага будаўніцтва. Атрамальныя поспехі мы маем у галіне літаратуры, музыкі, тэатра і іншых відаў мастацтва.

Таварышы, гэтых поспехаў мы дабіліся іменна дзякуючы таму, што Цэнтральны Камітэт нашай партыі на чале з тав. **Сталіным** і ўрад Совецкага Саюза аказваюць нам штодзённа магутнае падтрыманне, кіруюць намі, выпраўляюць нашы памылкі, указваюць неабходныя для ажыццяўлення мерапрыемствы.

Трэба асобна спыніцца на асаблівасцях класавага змагання ў нацыянальных рэспубліках, у тым ліку і ў Совецкай Беларусі.

Мне думаецца, што украінскія таварышы, выступаючыя ўчора з гэтай трыбуны, зусім правільна, пабольшэвіцку завастралі ўвагу сесіі ЦВК на тых праяўленнях контр-рэволюцыйнай нацдэмаўшчыны, на тых праяўленнях нацыяналістычнага ўхіла, якія мелі месца на Украіне і супроць якіх украінская партыйная арганізацыя вядзе жорсткую і бязлітасную барацьбу. Я асабліва павінен указаць на тое, што аналагічныя праяўленні контр-рэволюцыйнай нацдэмаўшчыны, аналагічныя праяўленні нацыяналістычнага ўхіла ўнутры партыйнай арганізацыі маюць месца ў Совецкай Беларусі ў КП(б)Б і супроць іх КП(б)Б вядзе бязлітаснае змаганне. Калі БССР дабілася ўказаных мною поспехаў, то мы іх дабіліся іменна дзякуючы бязлітаснай барацьбе комуністычнай партыі (большэвікоў) Беларусі супроць праяўленняў нацыяналістычнага ўхіла, супроць нацыянал-апартунізма, супроць контр-рэволюцыйнай беларускай нацдэмаўшчыны.

Калі з гэтай трыбуны выступаюць украінскія таварышы і гавораць аб нацыяналістычнай небяспецы на Украіне, калі аналагічныя факты маюць месца ў Таджыкістане, то мы, комуністы-нацыяналы, абавязаны прадумаць тое, што мела месца на Украіне і ў Таджыкістане, правяраць, ці няма аналагічных з'явішч у нас у нашых рэспубліках і абласцях. Нам неабходна з усёй рашучасцю весці барацьбу супроць гэтых з'явішч, бо гэта з'яўляецца нашым асноўным важнейшым большэвіцкім абавязкам. Мы павінны памятаць наступнае ўказанне Леніна «... соцыялісты прыгнечаных нацый павінны ў асаблівасці адстойваць і праводзіць у жыццё поўнае і безумоўнае, у тым ліку арганізацыйнае адзінства рабочых прыгнечаных нацый з рабочымі прыгнятаючых нацый. Без гэтага немагчыма адстаяць самастойную палітыку пролетарыяту і яго класавую салідарнасць з пролетарыятам іншых краін пры ўсіх і ўсякіх працвелках, адрадах і машэнніцтвах буржуазіі. Бо буржуазія прыгнечаных нацый пастаянна ператварае лозунгі нацыянальнага вызвалення ў ашуканства рабочых...»

Яркі прыклад таго, як нацыяналістычная буржуазія ператварала лозунг нацыянальнага вызвалення прыгнечаных у ашуканства рабочых і працоўных для сваіх контр-рэволюцыйных мэт, дае гісторыя контр-рэволюцыйнай барацьбы беларускай нацдэмаўшчыны.

Уся гісторыя існавання Совецкай Беларусі—гэта гісторыя барацьбы контр-рэволюцыйных нацыяналістычных зграй супроць соцыялістычнага будаўніцтва, за зварот панавання капітала, за адрыў Совецкай Беларусі ад Совецкага Саюза, за падпаралкаванне Совецкай Беларусі суседнім капіталістычным фашысцкім дзяржавам.

Гэту сваю барацьбу яны вялі ва ўсіх галінах будаўніцтва. У галіне прамысловасці яны стваралі свае тэорыі, якія былі накіраваны на поўны адрыў эканомікі Совецкай Беларусі ад эканомікі Совецкага Саюза. У галіне сельскай гаспадаркі яны стваралі тэорыю хутарызацыі, тэорыю немагчымасці калектывізацыі, і, апіраючыся на кулацкія хутарскія элементы, як на свае кадры, арганізоўвалі ўзброеную барацьбу супроць Совецкага Саюза. Яны сваю барацьбу ажыццяўлялі ў галіне літаратуры, мовы і інш.

Паўстае запытанне, чаму гэтыя з'явішчы маглі мець месца і ў Беларусі, і на Украіне, і ў Таджыкістане і, відавочна, у іншых нацыянальных рэспубліках і абласцях Совецкага Саюза. Гэта адбываецца ў сілу таго, што частка комуністаў, якія пастаўлены партыяй для кіраўніцтва работай, для таго, каб у практычнай рабоце змагацца за прынцыпы інтэрнацыяналізма, ускрываючы і бязлітасна перамагаючы нацыяналістычныя ўхілы, для рашучай барацьбы супроць нацдэмаўшчыны на ўсіх яе праяўленнях, гэтыя комуністы самі часта заражаны або падпадаюцца ўплыву акружаючага нацыяналістычнага асяродзішча і ў нашай партыі становяцца рупарам, агентурай гэтых нацыяналістычных контр-рэволюцыйных элементаў і вядуць сваю антыпартыйную і антысовецкую работу, прыкрываючыся фальшывым нацыянальным сцягам. Гэта адбываецца ў выніку страты большэвіцкай пільнасці. Калі Скрыпнік з'яўляецца сёння той фігурай, якая асабліва ярка выяўляе нацыяналістычны ўхіл унутры комуністычнай партыі Украіны, то, мне думаецца, што калі мы паскрабем сябе, то мы і ў сваіх арганізацыях знойдзем сваіх «Скрыпнікаў», сваю «скрыпнікаўшчыну» як нацыяналістычную плынь, як ухіл унутры нашай партыйнай арганізацыі. Сёння трэба гаварыць не толькі аб галіне Скрыпніку на Украіне, трэба гаварыць аб «скрыпнікаўшчыне» ўнутры партыйных арганізацый, мабілізуючы і ведучы барацьбу супроць яе. Трэба з асаблівай большэвіцкай пільнасцю адносіцца да складу нашых партыйных арганізацый, бо калі партыя на Украіне раскрыла гэтых правакатараў і здрадзнікаў, пралезшых у партыю для сваёй контррэволюцыйнай работы, то і мы ў Беларусі мелі і маем такіх-жа правакатараў і здрадзнікаў, якія пранікаюць у партыйныя арганізацыі для сваёй контр-рэволюцыйнай работы. Самым яркім прадстаўніком гэтай свядомай, прадуманай праважацыі ў нас на Беларусі з'яўляўся праф. Ігнатоўскі, які на працягу доўгага часу з'яўляўся членам партыі, уваходзіў у кіруючыя партыйныя і совецкія арганізацыі і які, як ён потым сазнаўся сам, увайшоў у партыю, каб правававаць партыю, быць нацдэмаўскім агентам унутры нашай партыі.

Нацдэмаўшчына Украіны аказалася звязанай з нацыяналістычнымі групамі Галіцыі. Яна арыентавалася на фантастычныя праекты нямецкіх фашыстаў у асобе Розенберга і інш. Дакументы, якія ёсць у нашых руках у сувязі з раскрыццём раду контр-рэволюцыйных арганізацый у Беларусі, гавораць аб тым, што беларускія контр-рэволюцыянеры, беларускія нацдэмы знаходзіліся ў сувязі з нацыянал-фашыстамі Заходняй Беларусі, што яны атрымлівалі грошы ад сваіх прыяцеляў і апекуноў з суседніх дзяржаў, што яны ў сваёй барацьбе супроць СССР, змыкаліся і атрымлівалі падтрыманне ад імперыялістычных інтэрвентаў, ад фашысцкіх арганізацый Польшчы і Германіі.

Значыцца, мы маем прамы саюз нацыяналістычных контр-рэволюцыйных груп і арганізацый у совецкіх рэспубліках з імперыялістычнымі інтэрвенцыяністкімі элементамі ў іх барацьбе супроць Совецкага Саюза. Гэта прымушае нас з асаблівай увагай адносіцца да прошукаў з боку пасобных кіруючых груп у буржуазных дзяржавах, зграй, накіраваных супроць СССР. Ад імя працоўных Совецкай Беларусі, я з усёй сілай заяўляю, што рабочыя, калгаснікі і ўсе працоўныя Совецкай Беларусі гатовы ў любую мінуту са зброяй у руках на справе цацпердзіць словы старшыні Совета Народных Камісараў т. **Молатава** і народнага камісара па замежных справах т. **Літвінава** аб тым, што мы напоўнены рашучасцю самым самаахвярным чынам змагацца супроць усякай спробы пасягання на СССР, на яго цэласць, гонар і будаўніцтва. Прапоўныя Совецкай Беларусі дадуць самы бязлітасны адпор усякай спробе адрыва Совецкай Беларусі ад Вялікага Совецкага Саюза.

БССР з'яўляецца пагранічнай рэспублікай. На працягу 700 кілометраў БССР мяжуе з буржуазнымі дзяржавамі. Таму ў нас, у БССР, пытанні падрыхтоўкі да абароны СССР стаяць асабліва востра, асабліва моцна. Партыя, советы, рабочы клас, калгаснікі Совецкай Беларусі робяць усё для таго, каб апраўдаць сваё гапаровае месца фарпоста Совецкага Саюза на заходняй граніцы СССР. **(Апладысменты).**

Пад надзейнай аховай Беларускай Ваеннай Акругі, яго камандавання і вайсковых часцей, Совецкі Саюз можа ўпэўнена прадаўжаць палітыку міра і справу соцыялістычнага будаўніцтва.

Тыя задачы, якія пастаўлены перад намі ў дакладзе старшыні Саўнаркома на 1934 год з'яўляюцца прадаўжэннем нашай барацьбы за выкананне другой пяцігодкі, пяцігодкі пабудовы бясклассавага соцыялістычнага грамадства. Тэзісы, апублікаваныя да партыйнага з'езда, рысуюць нам поўную карціну таго, якімі тэмпамі мы будзем ісці ў другой пяцігодцы для ажыццяўлення гэтых сусветна-гістарычных задач. Мне думаецца, задача ЦВК Саюза ССР заключаецца ў тым, каб заявіць Цэнтральнаму Камітэту нашай партыі, заявіць нашаму прасадыру і настаўніку тав. **Сталіну** аб тым, што мы, як орган дыктатуры пролетарыята, праз які партыя арганізуе самыя шырокія масы прапоўных на справу соцыялістычнага будаўніцтва, уцягвае іх у кіраўніцтва краінай, прымем усе меры для таго, каб поўнасцю выканаць задачы 1934 года, каб яшчэ больш умацаваць Совецкі Саюз, зрабіць яго яшчэ больш моцным і магутным, каб забяспечыць поўнае выкананне задач другой пяцігодкі. **(Апладысменты).**

## СУСТРЭЧУ XV З'ЕЗДА КП(б)Б АДЗНАЧЫМ ПОЎНЫМ ВЫКАНАННЕМ ПЛАНА ІЛЬНАЗАГАТОВАК

### СМАЛЯВІЦКІ І ЛЮБАНЬСКІ РАЁНЫ ВЫКАНАЛІ ПЛАНЫ ЗАГАТОВАК ПЕНЬКАВАЛАКНА

На 1 студзеня СМАЛЯВІЦКІ раён выканаў гадавы план загатовак пенькавалакна на 117,5 проц. На пункты Загатільна здана 141 цэнт. валакна.

***

ЛЮБАНЬСКІ раён выканаў гадавы план на 109,3 проц., здаўшы 634 цэнт. пенькавалакна.

### ПРАМТАВАРЫ ДЛЯ ПРЭМІЯВАННЯ ПЕРАДАВЫХ КАЛГАСАЎ СЕННЕНШЧЫНЫ

Прэзідыум праўлення Белкаапсаюза пастанавіў для прэміявання перадавых калгасаў Сенненшчыны завезці дадаткова ў раён наступныя прамтавары: баваўняных вырабаў на 5.000 рублёў, махоркі на 1.000 руб., папірос на 5.000 руб., галош на 1.000 руб., абутка на 3.000 руб., трыкатажа на 2.000 руб., хустак на 1.000 руб. і гатовай адзежы на 6.000 руб.

Апрача таго, для пашыўкі адзежы і абутка для Сенненшчыны выдзелена 15 індывідуальных талонаў.

### Зводка аб ходзе загатоўкі ільнапрадукцыі па БССР на 1 студзеня 1934 года (у процантах)

| РАЁНЫ | Загатоўлена: Усяго | Сялянскага валакна | Ільнатрасты |
|---|---|---|---|
| Сенненскі | 101,0 | 101,2 | 100,8 |
| Дрысенскі | 94,1 | 45,7 | 103,0 |
| Шклоўскі | 78,4 | 58,1 | 95,9 |
| Бешанковіцкі | 77,8 | 98,5 | 70,3 |
| Чашніцкі | 77,8 | 58,6 | 96,8 |
| Бялынецкі | 77,5 | 68,5 | 84,0 |
| Сіроцінскі | 71,9 | 99,6 | 58,9 |
| Суражскі | 71,9 | 80,4 | 60,8 |
| Ушацкі | 69,2 | 45,9 | 105,2 |
| Лепельскі | 69,1 | 59,5 | 76,6 |
| Крупскі | 68,0 | 47,2 | 210,0 |
| Асвейскі | 67,4 | 151,6 | 43,0 |
| Расонскі | 65,9 | 81,1 | 59,4 |
| Гарадоцкі | 65,8 | 73,1 | 58,9 |
| Дубровенскі | 62,4 | 55,7 | 69,0 |
| Талачынскі | 59,8 | 106,5 | 36,5 |
| Чавускі | 54,3 | 84,6 | 29,5 |
| Лёзненскі | 52,1 | 56,4 | 54,7 |
| Мсціслаўскі | 48,3 | 47,2 | 49,8 |
| Горацкі | 41,4 | 40,5 | 100,0 |
| Усяго па ільнаводчых раёнах | 68,3 | 64,9 | 71,3 |
| Усяго па БССР: | 66,0 | 63,1 | 70,4 |

### Сельсовет абараняе сабатажнікаў

**ТАЛАЧЫНО.** Плоскі сельсовет увесь час па выкананню плана ільнапаставак знаходзіцца ў прарыве. На 25 снежня план выкананы толькі на 17,5 проц.

Старшыня сельсовета **Маслоўскі** зусім не займаецца арганізацыяй ільнапаставак, ліберальнічае з сабатажнікамі ільназагатовак.

Кулакі — **Новаідворскі** (з вёскі Латышоў), **Галкоўскі** (з вёскі Гаварушак), **Шкіндзераў** (з вёскі Сакалянкі — не здалі ні аднаго кілаграма валакна і агітуюць сярод аднаасобнікаў, каб яны таксама не здавалі лён дзяржаве.

Маслоўскі патурае сабатажнікам.

Зацягваюць здачу ільнапрадукцыі і калгасы. Калгас **«Чырвоны барацьбіт»** ільнапастаўкі выканаў на **30** проц. Старшыня калгаса **Пыцько**, кандыдат партыі, не прымае ніякіх мер да пралезшага ў калгас банды та **Нарчука**, які раскрадвае і псуе лён.

У калгасе **«Чырвоная іскра»** мяльна-сушыльны пункт працуе толькі 2-3 гадзіны ў дзень. Старшыня калгаса **Чыкуноў** замест арганізацыі хуткай і добраякаснай апрацоўкі ільнатрасты, разважае:

— У нас лён дрэнны, няма чаго спяшацца.

Гэта зусім не верна. Узяць хоцьбы калгас «Барацьбіт», Рыдамскага сельсовета, які меў лён куды горшай якасці, чым у калгасе «Чырвоная іскра», аднак, калгаснікі арганізавалі апрацоўку яго так, што здалі валакно 10-12 нумарам. Разважанні Чыкунова накіраваны па эрыў ільназагатовак. Па яго віне астаўся на полі няўбраным лён з 9 га.

Калгас «Дзень Леніна» павінен здаць 84 цэнт. трасты, а здаў толькі 24 кгр. валакна. Старшыня калгаса **Тіханоўскі** займаецца адкрытым сабатажам. Каб не выканаць плана ільнапаставак, ён усю трасту распрадаў другім калгасам і аднаасобным гаспадаркам.

Адстае і **Паўлаўскі** сельсовет, па якому план ільнапаставак выканан на **33,7 проц.** З аднаасобнікамі не праводзіцца ніякай масавай работы. Па аднаасобным-жа сектары план выканан толькі на 61 проц. Члены сельсовета не сталі арганізатарамі ільнапаставак. Па вёсны **Марціяновічы** ільнапастаўкі выкананы на **20** проц

# З БУЙНЫМІ ДАСЯГНЕННЯМІ, ЗГУРТАВАНЫМ АТРАДАМ ДА ТРЭЦЯЙ РАЁННАЙ ПАРТКАНФЕРЭНЦЫІ, ДА XV З'ЕЗДА

## БОЛЬШЭВІКІ ГОМЕЛЬШЧЫНЫ ДА СВАЁЙ ПАРТКАНФЕРЭНЦЫІ І З'ЕЗДАЎ ПАРТЫІ

*Я. Шафарэнка*

*Сакратар Гомельскага гаркома КП(б)Б*

Праз некалькі дзён адкрываецца гарадская партыйная канферэнцыя, а за ёй—XV з'езд КП(б)Б і XVII з'езд ВКП(б). Уся краіна Саветаў, уся Совецкая Беларусь, пролетарскі Гомель і яго партарганізацыя да гэтых вялікіх дат, да слаўнага 15-годдзя адзінаго з атрадаў усёй ВКП(б)—КП(б)Б—падводзяць вынікі сваёй работы і дасягненняў, здабытых у барацьбе з апартуністамі ўсіх колераў, з кулаком і яго агентурай, з нацдэмамі, як прамымі агентамі польскіх і нямецкіх фашыстаў. Мы маем вялікія дасягненні, дзякуючы простым указаниям ЦК ВКП(б) і дарагога кравадыра т. Сталіна, дзякуючы непасрэднаму кіраўніцтву арганізатара соцыялістычных перамог у Беларусі—ЦК КП(б)Б і яго кіраўніка т. Гікало.

Разам з гэтым гомельская арганізацыя адзначае свае недахопы, для ліквідацыі якіх разгортваем работу ў сувязі з падрыхтоўкай да з'езду і сваёй партканферэнцыі.

### ГОМЕЛЬ ВЫРАС У БУЙНЫ ПРОЛЕТАРСКІ ЦЭНТР

У барацьбе за генеральную лінію партыі, на справе ажыццяўляючы ленінскую нацыянальную палітыку, вырас Гомель. З купецка-саматужнага гарадка Гомель вырас у адзін з буйнейшых пролетарскіх цэнтраў Совецкай Беларусі. У 1913 г. у парскім Гомелі працавала 1.700 рабочых, а ў 1933 г. у пролетарскім Гомелі працуюць каля 20.000 прамысловых рабочых. У 1913 г. валавая прадукцыя царскага Гомеля складала 1.700 тысяч руб., у 1933 годзе гадавая прадукцыя пролетарскага Гомеля складае 130 мільёнаў руб. Калі ў дароволюцыйным Гомелі існавалі такія прадпрыемствы, як былы завод Фрэміна, Агроскіна, дзе працавала па 30 рабочых, дык зараз у новым Гомелі па рокапеструяваных заводах працуюць тысячы рабочых. Калі асноўны капітал гомельскай прамысловасці ў 1931 г. складаў 30.187 тыс. руб., дык у 1933 г.—74.601 тыс. руб.

За гады першай пяцігодкі і першы год другой пяцігодкі ў Гомелі пабудаваны такія заводы, маючыя ўсесаюзнае значэнне, як Гомсельмаш, Дзюкамбінат—адзін з «518», Шклазавод, маргарынавы завод і інш.

Найпершай задачай гомельскай партарганізацыі было—забяспечыць парміальную работу сваіх прадпрыемстваў, асваенне новай тэхнікі. Адзначаючы ўмацаванне барацьбы за прамфінплан з года ў год, асабліва ў бягучым годзе ў параўнанні з мінулым годам, трэба з усёй праматой сказаць, што на жаль Гомельшчына ў сваёй барацьбе за прамфінплан усё яшчэ не дабілася выканання яго на 100 проц. па ўсёй прамысловасці ў цэлым.

У гэтым годзе ёсць зрух па выкананню колькасных паказальнікаў плана ўсёй прамысловасці, бяспрэчныя з'яўляюцца і поспехі па якасных паказальніках. За 9 месяцаў 1933 г. фонд зарплаты выдаткоўся на 83.5 проц. у той час як у 1932 г. пры меншым выпуску прадукцыі фонд зарплаты быў выдаткаван на 93.9 проц. Калі ў 1932 г. план прадукцыйнасці працы быў выкапан на 89.6 проц., дык за 9 месяцаў 1933 года мы маем выкананне па 99.2 проц. Поспех мы маем і ў галіне зніжэння сабекошта. Да гэтага трэба дадаць, што ўдалося выцягнуць з прарыва машына-будаўнічы завод «Пролетарый», значна падцягнуць Гомсельмаш і фабрыку «Праца». Значна лепш працуе ў гэтым годзе гомельская ЦЭС і інш.

Гаворачы аб адставанні гомельскай прамысловасці ў выкананні колькасных паказальнікаў прамфінплана і вынаўнасці выпуска высокаякаснай прадукцыі, трэба спыніцца на некаторых прычынах гэтага. Першая прычына гэта перш за ўсё наша дрэнная работа, дрэнная барацьба за правядзенне ў жыццё 6 гістарычных умоў тав. Сталіна, недастатковая барацьба за арганізацыю вытворчасці, за лепшае планаванне і т. д. А гэта барацьба павінна быць асабліва ўзмоцненай ва ўмовах навізны буйнейшых нашых прадпрыемстваў, якія патрабуюць асваення новых механізмаў, аўладання тэхнікай вытворчасці, ва ўмовах маладосці рабочага класа, у радах якога, асабліва на новых прадпрыемствах, вялікая праслойка люцэй, пядаўна прыйшоўшых на вытворчасць з вёскі. У гэтых умовах арганізацыйная і масавая работа гаспадарчых, партыйных і прафсаюзных арганізацый мае асабліва рашаючае значэнне.

Выходзячы з гэтага, гарком КП(б)Б і ўся партарганізацыя разгарнулі вялікую работу па ўмацаванню нізавога звяна і адзінаначалля на прадпрыемствах.

Упершыню ў БССР была праведзена канферэнцыя майстраў і начальнікаў цэхаў, па якой прысутнічала 400 чал., канферэнцыя па зніжэнню сабекошта на заводзе імя Ланцуцкага. У выніку на заводзе імя Ланцуцкага былі значна скарочаны выдаткі на вытворчасці, сабрана па некалькі дзесяткаў тысяч руб. рацыяналізатарскіх прапаноў. Такія-ж канферэнцыі па прыкладу завода імя Ланцуцкага правялі і інш. прадпрыемствы горада.

ГК КП(б)Б правёў параду ліцей шчыкаў, у выніку па Гомсельмашу, «Рухавіку рэволюцыі» і заводу імя Ланцуцкага значна зменшыўся процант брака па металалічню.

Праведзена канферэнцыя па ўпчыльненню рабочага дня на Гомсельмашы. Гэтая канферэнцыя, у якой прымалі актыўны ўдзел каля 500 рабочых, выявіла шмат фактаў дрэннай арганізацыі рабочага дня на гэтым заводзе і вызначыла канкрэтныя шляхі далейшай работы гэтага завода.

Таксама былі праведзены канферэнцыі жанчын-вынаходніц, на якой прысутнічала 400 чал., канферэнцыя ІТР, па якую з'явілася 400 чал., і рад інш. мерапрыемстваў.

Гэтыя масавыя мерапрыемствы з'явіліся моцным вагаром узнятага ініцыятывы мас. Яны зрабіліся фактарам разгортвання крытыкі і самакрытыкі, далі магчымасць шырокім пластам працоўных правяраць кожны ўчастак нашай работы, актыўна, пад кіраўніцтвам партарганізацыі, удзельнічаць ва ўзнаўленні работы кожнага з гэтых участкаў. Асабліва трэба падкрэсліць, што праведзеныя канферэнцыі не засталіся мітынгоўшчынай, вынікі іх работы выразіліся ў паляпшэнні якасных паказальнікаў нашай прамысловасці, у выняткоўнім з прарыва некаторых прадпрыемстваў. Калі сюды дадаць грамадны эрэх вытворчай актыўнасці, адгрыманы ў выніку чысткі партыі, дык стане зразумелым, чаму да чысткі завод «Рухавік рэволюцыі» меў 72 проц. выканання прамфінплана, а ў часе чысткі—121 проц. «Комінтэрн» да чысткі меў 87 проц., у часе чысткі—94 проц. «Палесдрук»—да чысткі — 93,3 проц., у часе чысткі—101 проц.

### К Ш АБАВЯЗАК—ДАЦЬ ВЫСОКАЙ ЯКАСЦІ ПРАДУКЦЫЮ

Зараз шырока разгорнута падрыхтоўка да партыйных з'ездаў. Кожны завод, кожная фабрыка, брыгада, кожны асобны рабочы, кожная работніца, ІТР уцягнуты ў падрыхтоўку да з'ездаў, узялі на сябе канкрэтныя абавязацельствы. Як выконваюцца гэтыя абавязацельствы, паказвае скачэнне да тэрміна гадавых прамфінпланаў заводамі імя Ланцуцкага, «Пролетарый», «Рухавік рэволюцыі», Палесдрукам і шчацінай фабрыкай. Гомельшчына шырока разгарнула паход імя т. Гікало і XVII з'езда ВКП(б), арганізавала соцыялістычны фонд імя Сталіна. Характэрнасць падрыхтоўкі да з'ездаў у гэтым годзе заключаецца ў тым, што па прыкладу чысткі партарганізацыі ўсе не ўчасткі работы побач з самімі членамі партыі падвергліся шырокаму прагляду праз крытыку і самакрытыку з боку шырокіх мас рабочых і калгаснікаў. Аб гэтым гаворыць той факт, што па чыстцы па гораду і вёсцы праведзена 1.150 сходаў, на якіх прысутнічала 51.609 членаў партыі і 96.602 беспартыйных, у спрэчках выступіла 14.548 членаў партыі, 4.906 беспартыйных і 943 комсамольцы. У падрыхтоўку да з'ездаў шырока ўключыліся друк і радыё. ГК КП(б)Б выпусціла тры нумары спецыяльных бюлетэняў у дапамогу партыйнай, прафсаюзнай і гаспадарчай пізоўцы.

Асаблівую ўвагу трэба звярнуць па якасць прадукцыі нашай прамысловасці, бо ў гэтай галіне мы недапусчальна адстаем. Указанне ЦО «Правда» аб фактах дрэннай якасці прадукцыі фабрыкі «Везувій» павінна стаць для нас сігналам для шырокай барацьбы з гэтым злом. Партыя і ўрад, рабочыя і калгаснікі патрабуюць ад нас высокай якасці прадукцыі, мы можам і павінны гэтае патрабаванне задаволіць. Трэба рашуча і моцна біць па тых кіраўніках, якія з-за свайго гнілога нутра звыкліся з выпускам бракаванай прадукцыі. На барацьбу за якасць прадукцыі трэба мабілізаваць рабочых. Кожны з іх ля свайго варштата, у сваім цэху і брыгадзе павінен стаць актыўным барацьбітом з бракам.

З ростам прамысловасці пролетарскага Гомеля шчыльна ўвязаны рост матэрыяльна-бытавых умоў рабочага класа. Гомель у гады царскай Расіі быў брудным горадам, без прамысловасці, без элек трычнасці, з крывымі брудными вуліцамі і хібаркамі рабочых акраін. За гады рэволюцыі, за гады першай пяцігодкі горад у корані змяніў свой твар. Няма ніводнага рабочага дома, дзе не было-б элек-

трычнай лямпачкі, тады як у старым Гомелі адзіная лямпачка гарэла ў доме князя Паскевіча. Зараз Гомель мае электрастанцыю ў 5.000 квт. энергіі, а праз некалькі месяцаў яна пашыраецца па 3.000 квт. За 1933 год выбрукава па клінкерам 53 тыс. кв. метраў шашы, заліта асфальтам 53.500 кв. метраў тратувара. Значна павялічыўся жыльфонд. За апошнія гады пабудаваны кала дванаццаці 3-4 паверховых дамоў, у якія заселены рабочыя з падвалаў.

У старым Гомелі была адна больніца і 10 дактароў. На медабслугоўванне горада ў год было адпушчана 180 руб., а зараз у Гомелі 10 больніц, 17 пунктаў аховы здароўя непасрэдна на прадпрыемствах і 9 у калгасах. На аховы здароўя ў 1933 г. выдаткавана 3.817 тыс. рублёў.

Значна вырасла сетка каапгасаў пры прадпрыемствах. Калі ў 1932 г. мы мелі 6 каапгасаў, дык зараз разам з самадзейнымі мы іх маем 39. Не гледзячы на тое, што ў гэтым годзе па паасобных гаспадарках былі факты безгаспадарчасці, усё-ж агульны ўраджай нашых прыгарадных гаспадарак у сярэднім даў па аднаго рабочага (індывідуальна і праз грамадскае харчаванне) па паўтоны розпай гародніны.

Вырасла сетка магазінаў. Калі ў 1932 годзе было 309 адзінак, дык у 1933 годзе ёсць 389. Сталовак у 1932 г. было 74 з ахопам 59.500 чал. у дзень, дык зараз ёсць 105, якія ахапляюць 69.200 чал. у дзень.

Не гледзячы на гэтыя поспехі ў галіне забеспячэння матэрыяльна-бытавых запатрабаванняў рабочых, мы не можам сказаць, што гэта нас задавальняе. Запатрабаванні рабочых Гомельшчыны неймавер па выраслі і мы абавязаны і можам іх поўнасцю задаволіць.

### ПОСПЕХІ Ў ГАЛІНЕ НАЦКУЛЬТБУДАЎНІЦТВА

Новы Гомель мае значныя поспехі і ў галіне нацкультбудаўніцтва. Совецкі апарат пераведзен на беларускую мову, умацаван рабочымі, нацыянальнымі кадрамі, якія выраслі з гушчаў працоўных нацыянальнасцей. Штодзённа растуць на сваёй рабоце прыйшоўшыя ў апарат рабочыя ад варштата, пролетарскія кадры нацыянальнасцей, людзі з новай ініцыятывай і пролетарскай загартаванасцю шаснаха змагаюцца з фактамі бюракратызма, якія яшчэ ёсць на сённяшні дзень у нашым совецкім апараце. Задача зараз заключаецца ў тым, каб больш рашуча высоўваць у апарат пролетарскія кадры. Трэба максімум увагі аддаць вельмі адсталаму ўчастку—правядзенню соцнамеснічтва.

У старым Гомелі былі 3 гімназіі з 300 вучняў. На асвету кіраўнікі памаладуры старога Гомеля адпускалі ў год 3.600 руб., тады як на ўтрыманне чыноўніцтва траціла 11 тыс. руб. у год, а яго сіяцельства князь Паскевіч траціў на буфет 13.784 руб. у год.

У новым Гомелі арганізаваны 72 школы на беларускай мове, у якіх навучаецца 16.526 дзяцей. Акрамя гэтага ёсць 3 яўрэйскія школы, 6 рускіх, адна польская і 6 змешаных. Гомель, як і ўся Беларусь, горад суцэльнай пісьменнасці. Калі ў 1930 годзе ў Гомелі зусім не было ВНУ, дык зараз іх ёсць 5, 10 тэхнікумаў, 3 рабфакі, соўпартшкола, навукова-даследчы інстытут і інш. У 1925 годзе на асвету было выдаткавана 1.216.000 руб., а ў 1933 годзе—3.937 тыс. руб.

Значна вырасла пролетарскія кадры педагогаў. У нас шмат нашых совецкіх настаўнікаў, якія высокакультурна, па-партыйнаму навучаюць нашы кадры. Але разам з гэтым трэба адзначыць, што з боку асветных арганізацый сустракаюцца факты слабой барацьбы з класава-чужымі элементамі, з асобнымі правымі нацдэмаўшчыны, вялікадзяржаўным шавінізмам і антысемітызмам, якія маюць месца ў навучальных установах Гомельшчыны. Не ўсюды пастаўлена на належную вышыню выхаванне дзяцей у комуністычным духу. Задача ўсёй партарганізацыі, видучы непрымірымую барацьбу з класавым ворагам, з нацдэмамі і нацдэмаўшчынай, як галоўнай небяспекай па даным этапе на ўмовах Беларусі, і надалей умацоўваць нашы поспехі ў галіне нацбудаўніцтва, не паслабляючы ў той-жа час барацьбы з вялікадзяржаўным шавінізмам і шавінізмамі іншых колераў (яўрэйскі, польскі).

### БОЛЬШ КЛОПАТАЎ АБ АРГАНІЗАЦЫЙНА-ГАСПАДАРЧЫМ УМАЦАВАННІ КАЛГАСАЎ

Сярод поспехаў нашага раёна важнейшым звяном з'яўляюцца поспехі ў рабоце па вёсцы. Гомельскі раён яшчэ ў 1931 годзе і нават у 1932 значна адставаў у галіне с.-г. будаўніцтва. Да сваёй гарпартканферэнцыі, гомельская партарганізацыя, працуючы па указаниям ЦК ВКП(б), тістарычных указаниях т. Сталіна, пад непасрэдным кіраўніцтвам ЦК КП(б)Б, і па ўчастку паляпшэння работы сельскай гаспадаркі рабіла дабілася значных перамог.

Быў дадзен жорсткі адпор кулаку і яго агентуры, якія прабавалі сабатажам і шкодніцтвам сарваць правядзімыя партыяй і ўрадам мерапрыемствы па вёсцы. Шмат кулакоў і іх агентаў былі вычышчаны ў гэтым годзе з нашых калгасаў. Сельска-гаспадарчыя работы г. г. прайшлі пад знакам паляпшэння якасці, правядзення рапняй сяўбы, барацьбы за высокі ўраджай. Супроць гэтых мерапрыемстваў апалчыліся ўсе варожыя элементы.

Але пагеракор ворагам, мабілізацыяй усіх калгаснікаў і працоўных адпаасобнікаў, наш раён, як і ўся Совецкая Беларусь, выйшаў з вялікімі перамогамі ў правядзенні с.-г. года. Пад кіраўніцтвам партарганізацыі і пры актыўнай дапамозе пролетарыята горада—шэфскіх арганізацый, дзякуючы арганізацыі палітаддзела МТС, мы дабіліся паступных вынікаў.

Значна павышана ўраджайнасць. Калі ў 1932 годзе па калгасах з аднаго га эпімалі 3.91 цэнтн. азімых, дык у 1933 годзе—9 цэнтн., бульбы па калгасах у 1932 г.—68.5 цэнтн. з га, у 1933 г.—95 цэнт. Значна пашырана пасеўная плошча. У 1931 годзе калгасы мелі 4.340 га зямлі, а ў 1933 годзе яны маюць 10.884 га. Таксама значна пашырылі свае пасеўныя плошчы соўгасы і адпаасобнікі.

Раён значна ўзброіўся с.-г. машынамі. Калі ў 1930 годзе было 6 трактараў, то зараз мы маем 52, розных с.-г машын было 40, а зараз ёсць 342. Значна павялічылася колькасць вывезеных угнаенняў. У 1932 годзе было вывезена на калгасныя палі 18.370 вазоў гною, а ў 1933 годзе—23.629 вазоў, штучных угнаенняў у 1932 годзе было вывезена 219 тон, а ў 1933 годзе—319 тон.

У выніку ўсяго гэтага значна палепшылася жыццё калгаснікаў. Калгаснікі такіх перадавых калгасаў, як імя Леніна, імя Будзённага, «Інтэрнацыянал» і інш. зрабілі значны крок па шляху да заможнага жыцця. Поспехі ў правядзенні с.-г. года абумовілі палітычны ўзрост свядомасці калгаснікаў і адпаасобнікаў, а ў выніку гэтага і паляпшэнне матэрыяльна-бытавых умоў калгаснікаў. Гомельскі раён датэрмінова і поўнасцю выканаў план збожжапаставак дзяржаве, высокаякасна і датэрмінова правёў веснавую і асеннюю сяўбу, выканаў бульбапастаўкі. Калгаснікі Гомельшчыны паказалі прыклад пролетарскага інтэрнацыяналізма, адгрузіўшы датэрмінова і з перавы канаппем бульбу рабочым Ленінграда.

Але, не гледзячы на гэтыя вялікія поспехі, мы павінны адзначыць недапушчальнае адставанне нашага раёна ў росце калектывізацыі (32 проц.). Гэта перш за ўсё — вынік зусім недастатковай работы ў галіне арганізацыйна-гаспадарчага ўмацавання калгасаў з боку ўсёй партарганізацыі. Гэта таксама сведчыць аб тым, што ва многіх калгасах і сельсоветах гэтаму пытанню аддаюць вельмі мала ўвагі. Гэты прарыў трэба найхутчэй ліквідаваць. Больш работы з працоўнымі адпаасобнікамі, больш клопатаў аб арганізацыйна-гаспадарчым умацаванні калгасаў! Гэта мы можам дасягнуць праз умацаванне калгасных брыгад, падрыхтоўкай калгасных кадраў. Шэфская работа павінна прыняць больш сістэматычны і канкрэтны характар. Уся партарганізацыя павінна таксама быць мабілізавана на ўмацаванне работы па жывёлагадоўлі. На гэтым участку мы таксама значна адстаем.

### ДА НОВЫХ ПЕРАМОГ

Па чале рабочых, калгаснікаў і ўсіх працоўных, змагаючыхся за дасягненні Гомельшчыны на ўсіх участках соцбудаўніцтва, стаяла і стаіць партарганізацыя, ажыццяўляючая слаўныя традыцыі Палескага камітэта, якім кіраваў тав. Кагановіч. Пад кіраўніцтвам партарганізацыі рабочыя і калгаснікі Гомельшчыны вылучылі нямала добрых кіраўнікоў. Можна назваць сотні і тысячы імён ударнікаў рабочых, работніц, калгаснікаў, калгаспіц, дырэктароў, сакратароў, якія штодзённа па-большэвіцку ля варштата, у калгасе, па заводзе і т. д. змагаюцца за справу партыі і рабочага класа, за выкананне ўказанняў правадыра партыі і рабочага класа—тав. Сталіна.

Гомельская партарганізацыя, следуючы і праводзячы традыцыі, лепшага саратніка тав. Сталіна—Л. М. Кагановіча, прыходзіць да сваёй партканферэнцыі, як ніколі, маналітнай і здаровай. У гэтым значна дапамагла праведзеная чыстка партыі, якая ачысціла Гомельскую партарганізацыю ад усяго гнілога і чужога. Гомельская партарганізацыя—арганізацыя пролетарская. Яна налічвае 83,4 проц. рабочых. За апошнія два гады прынята ў партыю 1.233 чал., з якіх 94,3 проц. рабочыя ад варштата. Але гэтае становішча не ўзнімае з нас адказнасці за далейшае выхаванне нашай партарганізацыі, за яе большэвізацыю. Тым больш, што гэта нам дыктуе ле маладосць (рабочых членаў партыі з партстажам з 1917 года — 6 ч., з 1924-28 г.—562 чал., а з 1929 і пазней—1.003 члены партыі і 596 кандыдатаў).

Партарганізацыя мае вялікія поспехі ў галіне марксіцка-ленінскага выхавання. У партшколах ахоплена 96 проц. членаў партыі, процант наведвання 85. Наша задача заключаецца ў тым, каб звярнуць большую ўвагу на ўзняцце кваліфікацыі прапагандыстаў, на больш ахоп партвучобай комсамольцаў і беспартыйных рабочых.

Гомельская партарганізацыя вытхавала моцную комсамольскую арганізацыю, у якой большасць рабочай і калгаснай моладзі, моцную піонерскую арганізацыю, людзей, якія выхаваны ў комуністычным духу. Перад комсамолам Гомельшчыны, перад піонерыяй стаіць зараз задача—пераведзі сваю работу на больш канкрэтныя рэйкі, забяспечыць свой уплыў на беспартыйную рабочую моладзь, уключыць усю комсамольскую арганізацыю ў барацьбу за ліквідацыю адставання прамысловасці, у барацьбу за рост калектывізацыі нашага раёна.

Перамогі Гомельшчыны дасягнуты, дзякуючы большэвіцкім указаниям ЦК ВКП(б), які даў бліскучы аналіз работы гомельскай партарганізацыі, канкрэтную праграму і метады, як трэба працаваць.

Праводзіць гэтую праграму ў жыццё канкрэтна, аперацыйна, штодзённа, з большэвіцкай празорлівасцю Гомелю дапамог ЦК КП(б)Б і першы сакратар яго тав. Гікало.

Праводзячы сваю гарпартканферэнцыю, рыхтуючыся да з'ездаў партыі, па-большэвіцку рэалізуючы ўказанні камісіі па чыстцы, Гомельская партарганізацыя і ўвесь пролетарыят яшчэ шчыльней згуртуецца вакол штаба нашай партыі—ЦК ВКП(б) і вялікага правадыра партыі і рабочага класа тав. Сталіна, і высока трымаючы сцяг Маркса-Энгельса - Леніна-Сталіна, пойдзе наперад, да новых перамог.

---

*Майстар па рамонту і абшыўцы паштовых вагонаў зав. імя Ланцуцкага*

*ЖЭЛЕЗНЯКОЎ*

## МАЯ ГРУПА ІДЗЕ НАПЕРАДЗЕ

У часе чысткі партыйнай ячэйкі выступаўшыя рабочыя ўказалі на недахопы ў маёй рабоце. Яны гаварылі, што ў мяне няма належнай цвёрдасці і патрабоўнасці, адсутнічае праф дысцыпліна на вытворчасці. Рабочыя таксама ўказалі на неправільную расстаноўку рабочай сілы.

Тав. САВІНКАЎ — каваль дэпо-сартыровачная.

Пярэчыць супроць гэтага быў нельга. Указанні былі правільныя. Пасля чысткі я пераглядзеў склад ударнікаў, правільна расставіў сілы, сілу з работы Мурашко, які дазарганізаваў работу ў брыгадах. І калі раней не абшыўцы процаэала 4 чэлы вокі, то зараз працуе 2. З работай яны спраўляюцца.

Пасля чысткі ў брыгадах, якія мне падначалены, не было ні аднаго парушэння працоўнай дысцыпліны. Мы дабіліся ліквідацыі брака.

Рабочыя пачалі цікавіцца вытворчасцю. Старыя ўзялі шэфства над маладымі рабочымі. Я сам навучыў працаваць спосабам Мальшэўскага, які да чысткі вельмі дрэнна працаваў, а зараз атрымаў ударную картку.

Мая група ідзе наперадзе. Мы што дзённа перавыконваем вытворчыя заданні. Абавязацельствы узятыя—даць арматуру для 4-х вагонаў звыш плана ў падарунак з'езду—мы выканалі 25 снежня.

---

*ЛЯШУК*

*Парторг брыгады столяраў завода імя Ланцуцкага*

## КАНКРЭТНА КІРАВАЦЬ ПАРТГРУПАМІ

У нашай брыгадзе 60 рабочых. З іх 4 члены партыі і такія-ж колькасць кандыдатаў. Вытворчая праграма на лістапад месяц намі была выканана на 109 проц. Брак зніжан да 3 проц. замест 5 дапушчаных планам.

Як мы змагаемся за план? Штодзённа наша брыгада абгаварвае недахопы і дасягненні мінулага дня. Асаблівую ўвагу наша партгрупа звярнула на барацьбу з бракам. Мы дабіліся таго, што бракаробы робяць справаздачу на агульных сходах рабочых аб прычынах брака.

Пасля чысткі партарганізацыі завода і асабліва ў сувязі з падрыхтоўкай да 17 партыйнага з'езда наш цэх абавязаўся да 25 снежня выканаць гадавое заданне, давесці брак да 2,5 проц.

Апрача гэтага кожны рабочы ўзяў на сябе канкрэтнае абавязацельства. Я сам абавязаўся даць звыш плана 60 калодак. Такія-ж абавязацельствы ўзялі на сябе ўсе фармоўшчыкі. Нашы абяцанні выканаў у жыцё. Заданне мы выканалі на 6 дзён раней тэрміна.

Аднак, трэба проста сказаць, што партканферэнцыі парторгамі кіруе недастаткова. Перад чысткай былі праведзены двухмесячныя курсы парторгаў і агітатараў. А вось зараз з намі ніхто не займаецца. Партыкому гэта неабходна ўлічыць і забяспечыць канкрэтнае кіраўніцтва партгрупамі.

Тав. ЖУРАЎЛЕЎ — лепшы ўдарнік завода імя Ланцуцкага

---

*БЕРКОВІЧ*

*Сакратар цэхавай партыйнай ячэйкі Гомсельмаша*

## ЧЫСТКА ЎЗНЯЛА НАШУ БАЯЗДОЛЬНАСЦЬ

Лінейны цэх Гомсельмаша да чысткі партыйнай ячэйкі ганебна адставаў. Наш цэх не даваў магчымасці бесперабойна працаваць іншым цэхам. Мы не выконвалі вытворчай праграмы, дрэнная была якасць прадукцыі. Брак ліцця даходзіў да 14-15 проц. Аб прарывах мы нельмі многа гаварылі. Гаварылі наогул, не ведаючы, за што канкрэтна спачатку ўхапіцца, каб выцягнуць цэх з прарыва.

Камісія па чыстцы ўскрыла прычыны ганебнага адставання. Камісія дала яскравыя сказанні, што патрэбна арабіць для таго, каб атрымаць перамогу. Наша ячэйка моцна ўзялася за перабудову работы, пераносячы цэнтр яе цяжара ў групу, брыгаду. Гэта дало нам магчымасць выкрыць недабранасць і бракаробаў.

Рабочы Шайфер працаваў абы з рук абыць. Ён выпускаў штодзённа да 16 проц. бракаванай прадукцыі. Жонцы бракароба Шайфера напісалі ліст:

«Паважаны таварыш! Вы напэўна не ведаеце, чаму так мала зарабляе ваш муж. Ён у нас лічыцца горшым бракаробам. Ён выпускае многа бракаванай прадукцыі, якая не можа быць скарыстана для выпуска сельска-гаспадарчых машын. Рабочыя на шчата цэха вынеслі пастанову выдзіраць з заработнай платы за брак. Вы лічыцем за гэта і з вашага мужа. Партыйная ячэйка і ўсе рабочыя цэха аб гэтым даводзяць да вашага ведама і просім вас уздзейнічаць на свайго мужа...»

Тав. АГРАНАТ — ударнік завода «Пролетары».

— Таварыш сакратар, я хачу давесці да ведама партыйнай ячэйкі аб тым, што брака ў мяне больш не будзе. Буду працаваць поўных 420 мінут. Паведамляю аб гэтым усіх рабочых ліцейнага цэха і наймацнейшае маёй жонцы ліст, што я стаў лепшым ударнікам...

За словамі ішлі справы. Шайфер пачынае перавыконваць штодзённыя нормы выпрацоўкі, няма ў яго брака. Ён стаў перадавым рабочым на заводзе. І цяпер пры сустрэчах рабочыя жартуюць:

— Што, Шайфер, жонка ўзадзейнічала?

— Не жонка, а цэхавыя арганізацыі, усе рабочыя. Намылка была, браточкі.

Шайфер не толькі стаў прыкладным на вытворчасці, ён зараз прымае актыўны ўдзел у грамадскім жыцці цэха, акуратна выконвае гурткі па вывучэнню палітграматы і тэхнікі.

Чыстка партыйнай арганізацыі выявіла многа сапраўдных барацьбітоў за план. Калі да чысткі брыгада абрубшчыкаў адставала, дык зараз яна з'яўляецца адной з перадавых. Парторг т. Жэлезняко ў адолеў забяспечыць авангардную ролю комуністаў на вытворчасці. Вытворчая праграма перавыконваецца, брак давядзен да 0,16 проц. замест 5 дапушчаных планам. Усе члены партыі ахоплены партвучобай.

Па прыкладу абрубшчыкаў працуе надзённа брыгада фармоўшчыц Лапенковай. Яшчэ ў 1930 годзе сама Лапенкова на механізмы Гомсельмаша глядзела напалоханымі вачыма. Яна прыйшла да нас з вёскі. Прыглядалася да ўсяго, што ёй было незразумелым. І зараз яна з'яўляецца адной з лепшых ударніц-брыгадзіраў. Яе брыгада перавыконвае задані не на 8 проц. і знізчыла брак.

Партыйная ячэйка на падставе ўказанняў праверкома лепшыя воп ты работы перанесіць на адстаючы ўчастак. Разгортваецца канкрэтнае спаборніцтва па аднолькавым прафесіям.

Атрымаўшы паведамленне пленума ЦК ВКП(б) аб прызначаным з'езде, мы абавязаліся выканаць гадавое заданне на 5 дзён раней тэрміна. Абавязацельства наш цэх пад мацаваў справай. 26 снежня ліцейны цэх гадавое заданне выканаў на 103.3 проц., прадукцыйнасць працы ўзнята на 102 проц.

Чыстка партарганізацыі паказала нам сапраўдных герояў соцыялістычнага будаўніцтва. Скарыстоўваючы іх вопыт, ячэйка і ўвесь наш цэх прыступае да выканання плану 1934 г. Будзем змагацца таксама за датэрміновае выкананне яго. Гэтага абяцаюць ліцейшчыкі Гомсельмаша XVII з'езду ленінскай партыі.

Линейная калибровочная мишень LRT-BE4-V2

# ІДУЦЬ БОЛЬШЭВІКІ ГОМЕЛЬШЧЫНЫ КП(б)Б І XVII З'ЕЗДА ВКП(б)

*ЛІПКІНА С. А.— парторг змены мяккага цэха харчовага камбіната „Спартак"*

## ЧЫСТКА ДАПАМАГЛА НАМ ВЫЙСЦІ Ў ПЕРАДАВЫЯ

Расцем мы, можна сказаць, як на дражджах. Замест арцелі вырас на гатах цэлы камбінат з 5 фабрык: 2 цукеркавых, адна пернічная, і латачная і 1 сельцерскіх вод. Не 12, а 900 рабочых. Работа механізавана: усё для таго, каб палегчыць працу рабочаму. Вось, напр., карамельны цэх. Ён абсталёван машынамі самай высокай тэхнікі кандытарскай выробчасці.

Хачу расказаць больш падрабязна пра сваю змену. У ёй 120 чал. Пра-

Тав. ПЕУЦОЎ — парторг пашывнага цэха фаб. «ТРУД».

цавалі мы да чысткі нашай парганізацыі в прарывам. Спачатку ўсё тлумачылі мы тым, што не хапае сырца. Але, калі сырца стала даводзі — усё такі план не выконвалі. У чым справа? Для мяне самой гэта было не зусім зразумела. Чыстка дапамагла мне ў гэтым разабрацца. Аказалася — вінаваты мы самі, бо працуем дрэнна. Больш ніякіх прычын няма. Тады ўзяліся мы за разгортванне соцспаборніцтва. Раней у нас былі соцдагаворы, але не было спаборніцтва. Ніхто дагавораў не правяраў. Масавай работай мы дабіліся таго, што кожны рабочы ўступіў у індывідуальнае спаборніцтва. Кожную пяцідзённку мы падводзім вынікі і паведамляем аб іх праз што дзенку і асобныя плакаты. Уся змена ўключылася ў паход імя XVII з'езда. Кожная работніца ўзяла на сябе канкрэтныя абавязацельствы, якія паказаны на чырвоным сцяжку супроць месца яе работы. Трэба сказаць, што ўключэнне ў паход праходзіла пры вялікім энтузіязме рабочых. Усё гэта разам узятае дапамагала таму, што змена в адстаючай стала перадавой. Выконваем цяпер план на 110-112 проц.

Асабліва моцна адчуваецца ўплыў чысткі на асобных членаў партыі. Да волі сказаць, што ўся партгрупа акуратна наведвае палітшколы, чаго раней не было.

У часе чысткі выяўлены адольныя таварышы, якіх мы раней не заўважалі. Вось т. Фарберава выдучана пасля чысткі старшым брыгадзірам па агрэгату. Праяўляе арганізацыйныя адольнасці.

Самае важнае, па-мойму, што в'яўляецца рэзультатам чысткі—гэта набліжэнне да беспартыйных. Гэта відаць хоць-бы з таго, што сходы партгрупы пачало наведваць значна больш беспартыйных, а вельмі часта бывае, што і ўся змена прысутнічае. А вось 11-XII, калі я паставіла на групе індывідуальныя справаздачы 6 членаў партыі, то па сходзе прысутнічалі не толькі ўсе 100 проц. сваёй змены, але і чалавек 20 з другіх змен.

Зараз у мяне ў змене арганізавана адна комсамольская брыгада па глазіроўцы. Раней яе не было. Работа па глазіроўцы самая кваліфікаваная. Трэба было падрыхтаваць хлопцаў, навучыць. Тады 5 комсамольцаў, якія працавалі раней, узяліся навучыць 5 новых. На працягу аднаго месяца хлопцы авладалі працэсам работы і ўжо выконваюць праграмны план. Асабліва добра паспяхае т. Фрэйман. Звярнулі мы ўвагу на ўзяцце культурнасці мас. Нельга зараз аставацца малапісьменным.

Адна маладая работніца Рахубіна (беспартыйная) з маёй групы не наведвала агульна-адукацыйнай школы пры камбінаце. Прыпалося мне весці з ёю сур'ёзныя індывідуальныя гутаркі, пераконваць, што застаецца малапісьменнай у совецкай краіне—вялікая ганьба. Дапамагло. Рахубіна пачала вучыцца. Большасць рабочых і работніц маёй змены навучаюцца ў агульна-адукацыйнай школе. Кожны рабочы выпісвае па 1-2 газеты.

Паляпшаецца і матэрыяльна-бытавое становішча рабочых. Нядаўна тром рабочым маёй змены адраманта ваны за кошт ФЗК кватэры. Харчаванне пасля пабудовы новай сталовай палепшылася. Словам, куды ні глянеш — поспехі ёсць. Але мы добра разумеем, што недахопаў яшчэ шмат і мы, зразумела, іх жывуем. У прыватнасці, мы зараз сур'ёзна аб гаварваем канкрэтныя мерапрыемствы, звязаныя з рэалізацыяй пастановы ЦК ВКП(б) аб санітарным становішчы прадпрыемства харчовай прамысловасці.

*ШНІЦЭР— начальнік цэха швэйнай фабрыкі „Комінтэрн"*

## ЦЯПЕР НЕ СОРАМНА ГАВАРЫЦЬ АБ СВАІМ ЦЭХУ

Цэх наш занесен на гарадскую чырвоную дошку. А яшчэ зусім няжаўна цэх галіфе быў самым адстаючым на фабрыцы. Сістэматычна не выконваў плана, выпускаў суцэльны брак. Расці пераробкі.

Пастановай бюро парткалектыва я быў перакінут з піджачна-суконнага цэха, дзе я працаваў кантралёрам па якасці, на пасаду начальніка цэха галіфе.

З чаго я пачаў, стаўшы начальнікам цэха? Я бачыў, што нізкая тэхналагічных працэсаў сур'ёзна гармозіць работу. Аперацыя — кінэ ці, напрыклад, заўсёды затрымлівала работу ўсёй лоўты. Гэтая аперацыя стала сваясаблівай пробкай у цэху. Сюды скаплялася маса прадукцыі і застравала тут. Некалькі менш, але ўсё-ж значна тармазілі работу — працэсы строчкі верхніх швоў і прышыўкі пазсоў. Таму, першай справай было — вывучыць усе працэсы работы цэха, правільна расставіць сілы і на аснове вывучэння і ўстанаўлення перадавых норм, дабіцца ліквідацыі нявязак і адставання цэха. Пры дапамозе ТНБ і перадавых рабочых мы гэта правялі. Работа пачала паляпшацца. Але гэта быў толькі пачатак. У ліпені ўсё-ж цэх не вылез з прарыва.

У жніўні на дапамогу прышла чыстка партыйнай арганізацыі. Яна ўзняла вытворчую актыўнасць не толькі комуністаў, але і беспартыйных. Крыўдна стала называцца адстаючым цэхам фабрыкі. Рабочыя далі абавязацельства выцягнуць цэх з прарыва і зрабіць яго перадавым па фабрыцы.

Далі слова — трэба яго стрымаць. І ўзяліся ўпарта за работу. Разгарнулася спаборніцтва брыгад, асобных рабочых паміж сабой. Пачалі праводзіць звяднасустрэчнае планаванне не толькі па колькасці, але і па якасці. Пералом быў дасягнут. Жнівень даў ужо 102 проц. выканання плана і значнае палепшэнне якасці прадукцыі. На гэтым мы не супакоіліся. Пераробак усё-ж было яшчэ многа. Камісія па чыстцы ў сваіх вывадах абавязала ячэйкі палегчы на паляпшэнні якасці. Разгарнулі мы вялікую масавую работу, праверку соцдагавораў, палепшылі склад грамадскіх інспектараў па якасці. Асабліва правялі сябе грамадзкія інспектары Майзельс і Зорын. Парткруппа пачала праводзіць работу сярод асобных бракаробаў (Бабінай, Самусь, Майзліс і г. д.). Гэта дало свае вынікі. Бракаробы сталі перадавымі рабочымі. Так, Бабіна, Самусь, Майзліс, не выконваўшыя раней плана ні па колькасці, ні па якасці, зараз перавыконваюць яго.

Вялікі вытворчы эфект дала ўведзеная новая сістэма, т. зв. эдымальная. Заключаецца яна ў тым, што кожная змена заканчвае сую работу, якую пачынае. Інакш кажучы, работа, пачатая першай зменай, ёю і заканчваецца, а не пераходзіць да другой змены. Гэтай сістэмай мы ліквідавалі ўраўнілаўку, пазялічылі адказнасць за пераробкі, вінаватыя ў гэтым пры дапамозе гэтай сістэмы лёгка выяўляюцца. Зараз, калі бяраш якую небудзь работу, дык адразу відаць, якой зменай яна выканана. Словам, сістэма спрыяла далейшаму росту колькасці і паляпшэнню якасці прадукцыі. У лістападзе, напрыклад, процант пераробак складае 0.12 пры адначасовым выкананні плана па колькасці на 109 проц.

У сувязі з уключэннем цэха ў паход імя тав. Гікало, работы ўзялі на сябе рад дадатковых абавязацельстваў, у прыватнасці — пакрыць за пазычанасць першых кварталаў з тым, каб датэрмінова выканаць гадавы план. Рад абавязацельстваў ужо выкананы. Замест 412 штаноў у дзень зараз выпускаецца 452. Словам цэх стаў непазнаваемы. 30 ударных картак, разданых у цэху — вынік вялікай работы на ўзмоцненай прадукцыйнасці працы і якасці прадукцыі. І цяпер не сорамна гаварыць аб сваім цэху.

Па масавай рабоце асабліва вызначаецца партгрупа тав. Булкінай. У яе групе кожны дзень праводзяцца гутаркі, чытка газет, выпускаецца штодзенка і т. д. У выніку індывідуальнай работы былыя лодыры — зараз лепшыя работніцы.

Налаўлілі мы і партыйную вучобу. Раней не вучобы была, а сістэматычныя зрывы. На сходзе перадавых рабочых ставілі пытанне аб необходнасці вучыцца ў фабрычна-партыйнай школе. Рабочы тав. Гефтар, напрыклад, заявіў:

«Якія мы будзем ударнікі, калі палітычна . непісьменныя. Прапаную не лічыць ударнікамі тых, хто не вучыцца».

Яго падтрымалі іншыя. Ухвалілі. вучыцца ўсім. Зараз 100 проц. рабочых цахаў вучацца ў палітшколах.

15 з'езд КП(б)Б і 17 з'езд ВКП(б) рабочыя цэха галіфе адзначаюць новым уздымам тэмпаў і якасці работы. 22 снежня гадавую праграму цэх закончыў. Рабочыя абавязаліся ўнесці ў фонд імя тав. Сталіна 3150 штаноў звыш плана. Пры прапрацоўцы кантрольных лічбаў на 1934 год рабочыя высунулі сустрэчную лічбу замест 410 дзённак штодзённа выпускаць 452. Цэх наш апраўдае запясенне на чырвоную дошку. Ён з гонарам будзе адстайваць права і ў далейшым займаць перадавое месца.



НА ЗДЫМКУ злева направа: 1. 160-кватэрны дом для рабочых завода імя ЛАНЦУЦКАГА. 2. Гомельскі хлебазавод. 3. 6-ая машына Добрушскай папяровай фабрыкі. 4. Канюшынасартоўка ГОМСЕЛЬМАША.

## КВІТНЕЕ НОВАЕ ЖЫЦЦЁ

Яшчэ тры гады таму назад на гэтым бупрыстым месцы быў пушысты мох і зрэдка раслі кучаравыя дрэўцы. Пустынна і дзіка выглядаў гэты прышасейны ўчастак у 13 кіламетрах ад Гомеля.

А зараз паглядзіце вакол, як казачна ўсё змянілася. Куды дзявалися гэтыя імхі і дрэвы? Дзе ён, пустынны пакой няўзнятай балотнай зямлі? Яго няма і ў паміне. За тое тут раскінуліся гігантскія карпусы завода, за тое выраслі да неба высокія трубы і ограмадныя трохпавярховыя дамы для рабочых. Тысяча пар рук штодзенна перамагаюць балотную дзікасць, процістаўляючы ёй перадавую індустрыяльную тэхніку. Якія тэмпы, які размах, якая грандыёзнасць! За тры гады пабудован новы гарадок, размясціліся складанейшыя машыны, буйнымі коласамі квітнее шумнае жыццё.

Шкляны гігант імя тав. Сталіна не ведае сабе роўных у краіне. Магутнасць яго перавышае магутнасць усіх шкляных заводаў Саюза на 13,6 проц. Калі-ж гаварыць аб умовах працы рабочых, дык наўрад ці знойдзецца падобны ў свеце. Недарма замежны спецыяліст тав. ДУДА, ахоплены высокімі пачуццямі прыгожасці і велічча заводскай тэхнікі, прама заяўляе: «Розніца ў тэхнічным узбраенні Гомельскага завода і, скажам, такога дасканалага чэха-славацкага прадпрыемства, як завод «Унтэррайхенау», відаць перш за ўсё на састаўным цэху. Састаўная на заводзе «Унтэррайхенау» змешчана ўнізе, у сутарэнні. Памяшканне ў параўнанні з корпусам гэтага-ж цэха на Гомельскім заводзе проста мізернае. Там цёмна — тут светла і прасторна. Там рабочыя працуюць у масках, тут масак ніякіх непатрэбна. Але перавага Гомельскай састаўнай не толькі ў гэтым. Перавозка шыхты, яе састаўных на заводзе «Унтэррайхенау» пабудавана па прынцыпу падчапной дарогі. Усе працэсы па перавозцы, загрузцы і пагрузцы праводзяцца там уручную. Тутжа няма ручных аперацый, няма і падчэпнай дарогі. Іх замянілі дасканалыя транспарцёры, прычым у такой колькасці, якая папярэджвае ад перабояў у падачы шыхты пры ўсякіх умовах. Перавага Гомельскага завода і ў падачы паліва да загрузачных каробак. У «Унтэррайхенау» вугаль падводзіцца на канатцы ўручную. Тут ён падаецца на эстакадзе механічна. Я не закранаю іншых навінак у тэхніцы вытворчасці. Але яшчэ адну рэчыцу павінен падкрэсліць. Там перадавая тэхніка няволіць рабочага. Тут яна вызваляе яго...»

Гэта толькі частка пераваг нашага завода супроць замежных. А як было з рэдуктарамі і рэастатамі? Іменна-ж на шкляным заводзе імя Сталіна ўпершыню ў СССР яны ўстаноўлены совецкай вытворчасці і работаюць лепш за імпартных. Гэтыя складанейшыя механізмы асвоены, можна сказаць, на ходу, без папярэдняга выпрабавання на іншых заводах.

***

Другі месяц усяго толькі працуе завод. Яшчэ шмат недахопаў, якія б'юць па плану. Але ўжо выпускаюцца перадавікі асвоення тэхнікі, вылучаюцца героі барацьбы за план. Вось возьміце маладога рабочага ВАЙЦЭХОЎСКАГА ВЛАДЗІМІРА. 15 год ён працуе на шкляных заводах. Калі ішоў на завод імя Сталіна, ён думаў сустрэць тых-жа шкладуваў, напружана выдуваючых з жалезных трубак агнявую масу. Але Вайцэхоўскі памыліўся. Тут тэхнічная адстапасць пазбаўлена права на жыццё. Яе замянілі механізаваныя ванныя печы і машыны ФУРКО, якія ў той час заканчваліся будаўніцтвам. Адчуў Вайцэхоўскі з першых дзён прыхода сваю немач. Веды шкладува, набытыя на старых заводах, тут аказаліся амаль непрымянімымі. Тэхнікай трэба кіраваць. І паступіў Вайцэхоўскі на курсы фуркістаў. Прагна глытаў ён кожнае слова навукі, паказваючы лепшыя ўзоры ўпартай работы над сабой.

— Быў я ўдарнікам на вытворчасці, — гаварыў Вайцэхоўскі, — не магу быць апошнім і на вучобе.

5 лістапада, калі ўрачысты гудок паведаміў аб пуску завода, Вайцэхоўскі Владзімір быў пастаўлен майстрам у машына-ванным цэху. Гэта па сутнасці асноўны механічны цэх. Складанейшая і адказнейшая справа. Сярод 10 старых майстраў ён тут адзін малады. Астатнія маюць вопыт 10-15 гадовай работы на механізаваных заводах. Але не паў духам Вайцэхоўскі. Успомніў ён мудрыя словы прадзедыра нашай партыі «Няма такіх крэпасцяў, якіх не ўзялі-б большэвікі».

Праўда, цяжка было спачатку. Асабліва ў сувязі з хістаннямі тэмпературы канала і печы Фурко. Пракпыку праходзіў на заводзе, дзе тэмпература канала і печы заўсёды нармальная (устаноўленая), а тут па віне газагенератарнай станцыі, якая ўсё яшчэ працуе дрэнна, хістанні тэмпературы даходзяць да 100 градусаў. Нявопытнасць прыводзіла да таго, што змена Вайцэхоўскага мела штодзенна па 2-3, як кажуць шклоўшчыкі, падзенні машыны, абрывы пенты шкляной масы. Вайцэхоўскага гэта вельмі турбавала.

— Няўжо я тут страчу гонар быць ударнікам? — мучыла яго думка. Каб гэтага не здарылася, ён упарта пачаў вывучаць самыя найдробныя дэталі справы. Старыя майстры ЛОКЦЕЎ і САЛАЎЁЎ аказалі яму ў гэтым дапамогу. Уважліва слухаў ён іх указанні. Глядзеў, як яны працуюць. І не прайшло гэта дарам. За паўтара месяца Вайцэхоўскі Владзімір заваяваў усезаводскую славу. Двухтысячны калектыў рабочых і інжынерна-тэхнічных работнікаў завода ведаюць зараз Владзіміра, як аднаго з лепшых майстраў самага адказнага машына-ваннага цэха, які звёў колькасць падзення машын да мінімума. Зараз ён перагнаў свайго настаўніка Салаўёва і ўступае толькі аднаму Локцеву, які ідзе першым па цэху.

Вайцэхоўскі па праву вярнуў сабе годнасць ударніка. І не дарма ён ужо два разы прэміраваны. Але ён не спыняецца на дасягнутым, хоча тэхнікай авладаць дасканала. І таму ён акуратна займаецца ў гуртку інжынерна-тэхнічных работнікаў завода, капаецца ў тэхнічнай літаратуры, вядзе доўгія гутаркі з інжынерамі.

Тав. ВАЙЦЭХОЎСКІ — лепшы ўдарнік шклазавода імя СТАЛІНА

Вайцэхоўскі, як і тысячы падобных яму рабочых, зразумеў, што ў Совецкай краіне навука знаходзіцца ў непасрэднай сувязі з практыкай, што рухаць наперад соцыялістычную вытворчасць, якая не ведае капіталістычнай эксплаатацыі, можна толькі аўладаўшы тайнамі навукі і тэхнікі...

***

Вайцэхоўскі Канстанцін — бацька Владзіміра. Яму 57 год. 47 год ён работае на шкляных заводах. Але тут, на шкляным заводзе імя тав. Сталіна, ён упяршыню сутыкнуўся з сапраўднай тэхнікай. Да гэтага часу ведаў ён адзінае механічнае абсталяванне шклазаводаў — бягуны. Яны служылі для самых працаёмкіх працэсаў: размола матэрыялаў і інш. Уся астатняя работа рабілася рукамі і пёгкімі. Шмат цяжкіх год асталося ззаду. Стары Вайцэхоўскі працуе зараз шклаварам на механізаваным заводзе імя Сталіна.

— Хоць і пёгка стала цяпер, — кажа ён, — калі машына працуе за нас, хоць нельга параўнаць з мінулымі цяжкімі ўмовамі, але адказнасць адчуваю вялікую. Вось працуе машына, а прагледзіш, зазяваешся, і палезе ў печ каменне, крэйда, папсуюць якасць, звядуць нада душой за вытворчасць. Калі яго вылучылі дзяжурным інжынерам, у змене быў прарыў: крывілася шкляная істужка. У чым прычына? Напружана працаваў розум Копфнера. Ака залася ненармальная тэмпература вакол печы і канала Фурко, халоднае паветра з другой сістэмы завода крывяць істужку. Тады Копфнер загадаў зрабіць перагародку. Гэта пазбавіла завод ад вялікага брака.

Актыўную барацьбу павёў Копфнер з збрывамі істужак. Збірае змену, абгаварвае прычыны, вучыць, як працаваць.

Усяго паўтара месяца працуе тав. Копфнер дзяжурным інжынерам, а змену ўжо вывеў у перадавыя рады.

***

З кожным днём павялічваецца пік лепшых ударнікаў шкляного гіганта імя тав. Сталіна. Сярод іх: рэзчыкі бемскага шкла ШЭЎЦОЎ і БЛАЖКЕВІЧ, шклавар СКВАЖНІК Ів., майстра САЛАЎЁЎ, начальнік машынна-ваннага цэха СПІРЫДОНАЎ і інш. Гэта сапраўдныя героі соцыялістычнай вытворчасці, барацьбіты за аўладанне тэхнікай. Такія героі могуць быць толькі ў краіне, якая не ведае капіталістычнай эксплаатацыі, у краіне, дзе праца ёсць справа славы, справа гонара і доблесці.

Р. ДОДЗІН.

ГОМЕЛЬ, «КАСЦЮКОЎКА».

## Аб лесазагатоўках і лесавывазцы

### ПАСТАНОВА ЦК КП(б)Б І СОВЕТА НАРОДНЫХ КАМІСАРАЎ БССР

ЦК КП(б)Б і СНК БССР адзначаюць, што, не гледзячы на выключна спрыяльныя ўмовы — устаналіўшаяся санная дарога, — выкананне плана лесазагатовак і вывазкі IV квартала 1933 г. яўна правальваецца. На 20-XII-33 г. загатоўлена будаўнічай драўніны 59,4 проц., вывезена 19,9 проц., загатоўлена дроў 60,4 проц., вывезена 28,4 проц. Асабліва ганебна зрываюць раёны: Бялыніцкі, Клічаўскі, Чачэрскі, Бярэзінскі, Бабруйскі, Рэчыцкі, Дубровенскі, Лагойскі, Сенненскі, Петрыкоўскі, Мазырскі і Быхаўскі.

Такое становішча з'яўляецца рэзультатам яўнай недаацэнкі і ігнаравання значэння лесазагатовак і вывазкі з боку леспрамгасаў, цэлым радам РК і РВК і нездавальняючага аперацыйнага кіраўніцтва леспрамгасамі з боку трэста Лесбел і ўпаўнаважанага НК Леса.

ЦК КП(б)Б і СНК БССР пастанаўляюць:

1. За яўны зрыў плана дровалесазагатовак і вывазкі абвясціць суровую вымову дырэктарам леспрамгасаў: чачэрскага — тав. БУЙНОЎСКАМУ, бабруйскага — тав. ЛЕВІНУ, петрыкоўскага — тав. БУЛАТОЎСКАМУ, быхаўскага—тав. КЕЗІКУ.

Папярэдзіць сакратароў РК і старшынь РВК раёнаў: Чачэрскага, Петрыкоўскага, Бабруйскага і Быхаўскага, што калі імі на працягу бліжэйшых дзён не будуць прыняты меры да стварэння рашучага пералома ў выкананні лесазагатовак і вывазкі, з боку ЦК КП(б)Б і СНК БССР да іх будуць прыняты суровыя меры партыйнага ўздзеяння.

2. На бліжэйшым пасяджэнні Бюро ЦК заслухаць даклады некаторых сакратароў РК і дырэктароў леспрамгасаў аб ходзе лесазагатовак і вывазкі, дапусціўшых т. т. ПЫЖЫКАВУ і РОЗІНУ намецець спіс раёнаў.

3. З 5-га студзеня 1934 г. правесці радыёперакліччу раёнаў з інфармацыяй сакратароў РК, старшынь РВК і дырэктароў леспрамгасаў аб ходзе лесазагатовак і вывазкі. Даручыць агітмасаваму аддзелу ЦК КП(б)Б і ўпаўнаважанаму НКЛеса тав. РОЗІНУ арганізаваць перакліччу, шырока папулярызаваўшы гэтае мерапрыемства ў друку.

4. Для фарсавання лесавывазкі камандыраваць тэрмінам на 6 дзён у пасадзі ўпаўнаважаных ЦК і СНК БССР наступных т. т.: КУДЗЕЛЬСКАГА (Вярхсуд)—Петрыкоў, Жыткавічы; РОЗІНА — Барысаў і Крупкі; ФЛЮРА — Мазыр і Нароўля; РАЗЕНГАЎЗА — Глусн і Парычы; ШАПІРА — Горкі, Касцюковічы, і ЛІСКОВІЧА — Сіроціна, Сураж. Тэрмін выезда не пазней 3 студзеня г. г.

5. Указаць усім упаўнаважаным ЦК і СНК БССР па ільназагатоўках, а таксама выехаўшым таварышам па правядзенню выбараў парторганаў, што, таксама, як і за лён, яны адказваюць і за лесавывазку, абавязаўшы іх як у часе правядзення перавыбараў нізавых парторганаў, так і на самых райпартканферэнцыях завастрыць увагу партарганізацый на выкананні плана лесавывазкі.

6. Адзначаючы яўна нездавальняючы ход заключэння дагавораў на лесазагатоўку і вывазку, асабліва з аднаасобным сектарам, абавязаць усе РК, РВК і дырэктароў леспрамгасаў разгарнуць масавую работу і дець рашучы адпор кулацкаму сабатажу, дабіўшыся рэальных рэзультатаў па заключэнню дагавораў.

7. Устанавіць аж да адмены замест існуючых дзённых зводак па лесавывазцы — пяцідзённыя.

Абавязаць рэдактароў газет «Звязда» і «Рабочай», в таксама раённых друк сістэматычна асвятляць ход лесавывазкі, змяшчаючы пяцідзённыя зводкі.

ЦК і СНК падкрэсліваюць, што ўсякія спасылкі на якія-б там ні было «аб'ектыўныя» прычыны, у тым ліку на ільназагатоўкі, будуць разглядацца, як апартуністычныя адхіленні ад важнейшага задання партыі і ўрада.

НАМ. СТАРШЫНІ СНК БССР БАЛЦІН.
САКРАТАР ЦК КП(б)Б ШАРАНГОВІЧ.

## СТАРШЫНЯМ РАЙВЫКАНКОМАЎ, ДЫРЭКТАРАМ ЛЕСПРАМГАСАЎ

Будучы на сесіі ЦВК Саюза ў Маскве выявілася, што ўсе рэспублікі, вобласці з гонарам справіліся з выкананнем плана дровалесавывазак і дровалесазагатовак, сярод усіх рэспублік, абласцей ганебна сарвала план Беларусь. Гэта стала вядомым усёй сесіі. Гэтае ганебнае адставанне вы абавязаны ва што-б там ні стала ліквідаваць. У бліжэйшыя дні ўсе райвыканкомы, сельсоветы і леспрамгасы павінны рашуча ўзяцца за выкананне плана лесавывазак і лесазагатовак і ў першай палове студзеня перакрыць прарывы чацвертага кварта ла і забяспечыць поўнае выкананне плана першага квартала. Тэлеграфце Саўнаркому праз тры дні аб вашых канкрэтных мерах. Звараваю ўвагу на недапушчальнае навучанне амаль усяго раённага друку па пытаннях барацьбы за выкананне плана лесных работ.

СТАРШЫНЯ СОЎНАРКОМА БССР ГАЛАДЗЕД.

## Калі вяртушку вядуць ударнікі

### (Па тэлефону ад нашага спецкора)

Вяртушка № 445 з дровамі прыбыла ў Менск у 6 г. 20 мін. раніцы. Пад выгрузку была дана 8 г. 20 мін. У 12 гадз. 12 мін. поезд № 852 адыйшоў на Заходнюю дарогу. Такім чынам, была ПОЎНАЯ МАГЧЫМАСЦЬ прычаніць вяртушку да поезда № 852 і адправіць

Аднак, па нядбайнасці дзяжурнага дыспетчара тав. ШЫЛАВА і дзяжурнага па ст. Менск тав. СОКАЛАВА вяртушка з гэтым поездам НЕ ПАЙШЛА. Наступны поезд адыходзіў у 16 г. 30 мін.

Патрэбна было, каб начальнік станцыі тав. ЛАДЗІС асабіста ўмяшаўся ў гэтую справу. Тады былі прыняты тэрміновыя меры і вяртушка была адпраўлена ве ў 16 г. 30 мін., а ў 15 г. 14 мін., г. зн. ПА 1 ГАДЗ. і 15 МІН. РАНЕЙ.

Гэты выпадак лішні раз пацвярджае, што ёсць ПОЎНАЯ МАГЧЫМАСЦЬ СКАРАЦІЦЬ ТЭРМІН ЗВАРОТА ВЯРТУШАК ДА МІНІМУМА.

У 15 гадз. 14 мін. са станцыі Менск адышлі ў Асіпавічы абедзве вяртушкі з адным паравозам. На чале поезда — брыгада ў складзе машыніста-настаўніка тав. ЛАШКОВА, машыніста ПАЎЛОЎСКАГА і пам. машыніста МІКОВІЧА. Брыгада паставіла сабе задачу прыйсці ў Асіпавічы без спазнення. Гэта задача была ВЫКАНАНА.

Калі равей вяртушкі спыніліся і доўга затрымліваліся на ст. Міхаповічы, Рудзенск, Пухавічы і інш., то па гэты раз ніякіх затрымак паравозная брыгада НЕ ДАПУСЦІЛА. Нават на ст. Пухавічы дзе патрэбна было спыніцца для чысткі топкі, на што даецца 36 мін., брыгада справілася ЗА 20 МІНУТ.

Такім чынам, дзякуючы ўдарнай рабоце брыгады вяртушка прыбыла ў Асіпавічы БЕЗ СПАЗНЕННЯ ў 8 г. 27 мін., г. зн. зрабіла рэйс за 5 ГАДЗ. і 13 МІН.

ГАСМАН.

## Адгрузка дроў Менску

### ЗА 2 СТУДЗЕНЯ

| ЛЕСПРАМГАСЫ | Падвезена да чыгункі | Затрэбавана вагонаў | Пагружана | Астача дроў на станцыі |
|---|---|---|---|---|
| Асіпавіцкі | 81 | 160 | — | 817 |
| Петрыкоўскі | 12 | 72 | — | 349 |
| Мазырскі | 28 | 91 | — | 218 |
| Глускі | — | 110 | — | 330 |
| Бабруйскі | 12 | 70 | 29 | 425 |
| Парыцкі | 18 | 85 | — | 421 |
| Клічаўскі | 35 | — | 35 | — |
| Разам | 186 | 588 | 64 | 2560 |

## Аршанскі леспрамгас выканаў гадавы план

Пасяховым выкананнем плана лесазагатовак і лесавывазкі ў IV квартале Аршанскі леспрамгас выканаў гадавы план 1933 года па ўсіх асартыментах ДАТЭРМІНОВА на 2 дні — 29 снежня.

Змагаемся за выкананне плана лесазагатовак і лесавывазкі 1934 года.

Дырэктар леспрамгаса ЛІЎШЫЦ.
Сакратар парт'ячэйкі КРОІК.
За старшыню РК саюза лесасплава ХРАПОЎСКІ.

## Уключаюцца ў соцспаборніцтва з Чувашыяй

ГОРКІ.

Горацкі раён адзін з адстаючых у БССР па дарожнаму будаўніцтву. Рад сельсоветаў (МАСЛАКОЎСКІ, ЛЮБІСКІ і інш.) бездарожжам увосень амаль адрэзаны ад раённага цэнтра.

Планы дарбудаўніцтва ў раёне ніколі не выконваліся. Толькі за адзін 1933 г. не скарыстана каля 500 т. р. па працудзелу масельніцтва.

Прэзідыум РВК зацвердзіў план дарожных работ на 1934 год. Планам прадугледжана пашырэнне будаўніцтва за лік бюджэтных асігнаванняў, ведамственых і грамадскіх сродкаў, разбіўка ўчасткаў дарог паміж калгасамі і совецкімі гаспадаркамі.

Прыступілі ўжо да вывазкі і заготоўкі будматэрыялаў з такім разлікам, каб з наступленнем вясны быць поўнасцю падрыхтаванымі да дарбудаўніцтва.

РВК пастанавіў уключыцца ў спаборніцтва БССР і ЧУВАШЫІ на лепшае правядзенне дарбудаўніцтва 1934 г. і выклікаў па соцспаборніцтва МСЦІСЛАЎСКІ раён.

ЯУХ. Г.

*Пасля лейпцыгскага прыгавора*

## НА АБАРОНУ АПРАЎДАНЫХ КОМУНІСТАЎ

ПАРЫЖ, 1 студзеня. (БЕЛТА).

Дэлегацыя прафесароў французскіх універсітэтаў наведала германскае пасольства ў Парыжы, каб Дзі мітраву, Папову і Таневу былі прадастаўлены права і магчымасць выехаць з Германіі.

***

ЛОНДАН, 2 студзеня. (БЕЛТА).

«Н'юс кронікль», гаворачы аб вяволенні чатырох комуністаў, апраўданых лейпцыгскім судом, указвае, што поўнае маўчанне адносна іх лёса ў момант апраўдання з'яўляецца загадковым і набывае злавесны характар».

Паводле слоў газеты, калі германскі ўрад не прыме адпаведных мер, гэта дасць палітаву для рознастайных дапушчэнняў.

### АНДРЭ ЖЫД ВЫЯЖДЖАЕ У БЕРЛІН

ПАРЫЖ. (БЕЛТА).

Вядомы французскія пісьменнікі Андрэ Жыд і Андрэ Мальро выяжджаюць у Берлін з намерам дабіцца выкавлення апраўданых комуністаў.

## АТАКА ПРАДПРЫЕМЦАЎ НА ЗАРПЛАТУ ПОЛЬСКІХ РАБОЧЫХ

ВАРШАВА, 2 студзеня (БЕЛТА). Пілсудскі «Роботнік» змяшчае пад рэзкзны агляд зніжэння зарплаты польскімі прадпрыемцамі за 1933 год. Газета не знаходзіць іншай характарыстыкі для мінуўшага года, як «суцэльны лямант голада». Ва ўсіх галінах прамысловасці адбылося значнае зніжэнне зарплаты.

Так, у вугальнай прамысловасці, у прыватнасці ў Верхняй Сілезіі, зарплата зніжана з 6 да 15 проц., у Кракаўскім-яка і Дамброўскім басейнах — з 10 да 15 проц.

На цагельных заводах Усходняй Галіцыі зарплата зніжана ад 15 да 17,5 проц. На цементных заводах прадпрыемцы разарвалі калектыўны дагавор, знізіўшы зарплату на 3—12 проц.

Не адноўлен калдагавор у металапрамысловасці Польшчы. У рэзультаце на ліцейных заводах у Лодзі зарплата зніжана на 10 проц.

У Пазнанскім ваяводстве зарплата металістаў была ўрэзана на 10-15 проц.

Значнае скарачэнне зарплаты у 1933 г. адбылося таксама ў тэкстыльнай прамысловасці Польшчы. Даволі сказаць, што не гледзячы на гераічную стачку лодзінскіх тэкстыльшчыкаў, іх зарплата цяпер ніжэй на 12-15 проц. зарплаты 1928 г.

У цукровай прамысловасці зарплата зніжана ў ваяводствах усходняй і цэнтральнай Польшчы на 9 проц. і ў заходніх ваяводствах — на 15 проц.

Найбольш значнае скарачэнне зарплаты адбылося ў буданічай прамысловасці. У Варшаве цяпер не існуе нізкіх дагавораў з рабочымі, і прадпрыемцы знізілі зарплату на 40 проц.

У Пазнанскім ваяводстве з 1-га студзеня 1933 г. зарплата будаўнікоў скарочана на 25 проц., у Кракаўскім ваяводстве з мая месяца — на 10—28 проц.

«Роботнік» паведамляе, што ўрад падрыхтаваў новы закон, згодна яко му з 1-га студзеня 1934 г. сотням тысяч нізка аплачваемых служачых размер пенсіі за выслугу год скарачаецца на 20 і больш проц.

## ПРОЛЕТАРСКІ АДПОР ФАШЫСТАМ

ПАРЫЖ, 2 студзеня. (БЕЛТА).

Як паведамляе «Юманітэ», у Гамбургу на буйным заводзе рабочыя адмовіліся ўнесці «добраахвотны» ўзнос на карысць «зімняй дапамогі», якая спаганяецца нацыянал-соцыялістамі. На другім заводзе былі праведзены частковыя забастоўкі. На сценах завода былі вывешаны комуністычныя лозунгі.

Пад пашскам пагрозы работых аб'явіць забастоўку прадпрыемцы каўчукавага завода вымушаны былі адмовіцца ад свайго рашэння звольніць рабочых гэтага завода і замяніць іх членамі «Сталёвага шлема».

На арганізаваным нацыянал-соцыялістамі сходзе служачых выварочай каперацыі тысячы служачых дэманстрацыйна пакінулі залу, адмовіўшыся ад удзела ў спрэчках па дакладу нацыянал-соцыяліста.

## ДЫВЕРСІІ АЎСТРЫЙСКІХ ФАШЫСТАЎ

ВЕНА, 2 студзеня (БЕЛТА).

Па ўсёй Аўстрыі ўзмацнілася актыўнасць нацыянал-соцыялістаў. У Брэгенсе ва ўрадавым будынку адарыўся выбух, значна пашкодзіўшы будынак. У Вене раскрыты 3 нацыянал-соцыялістскія арганізацыі. Арыштаваны і зняволены ў канцлягер многа прыхільнікаў нацыянал-соцыялістаў.

Улады канфіскавалі транспарт ручных гранат і газавых бомб, якія перапраўляліся з Германіі ў Аўстрыю разам з буйнай партыяй нацыянал-соцыялістскай прапагандыстыкай літаратуры.

Характэрна, што, не гледзячы на ўзмацненне тэрарыстычнай дзейнасці аўстрыйскіх нацыянал-соцыялістаў, улады ўсімі мерамі прабуюць аблегчыць згоду з нацыянал-соцыялістамі. Так, пракуратура спыніла праследванне супроць кіраўніка нацыянал-соцыялістскай арганізацыі ў Аўстрыі Фрайсенфельда і выпаліла яго з пад арышта.

Апроч таго, прэзідэнт памілаваў нацыянал-соцыялістскага тэрарыста, германскага барона Альвенслебена, страляўшага ў кіраўніка хеймвера Штэйле і асуджанага да 3 год турмы.

### БЕЛЫ ТЭРОР НА ФІЛІПІНАХ

ШАНХАЙ, 2 студзеня (БЕЛТА).

У Маніле (Філіпіны) вынесен прыгавор па справе 16 комуністычных лідэраў. Яны прыгавораны да турмы на тэрміны ад 4-х да 18 месяцаў з наступнай высылкай у аддалёныя раёны на 8 год.

### ПРОШУКІ ЯПОНСКАГА СТАУЛЕННІКА

БЕЙПІН, 2 студзеня (БЕЛТА).

Выступленне генерала Лю Гуй-лана, якое, як лічаць, натхнецца японскімі агентамі, прымае сур'ёзны характар. Баі паміж яго войскамі і ўрадавымі адбываюцца ў раёне Таншаня за 35 клм. ад Бейпіна.

Уладныя войскі адцясніілі часці Лю Гуй-дана толькі з дапамогай значных падмацаванняў. Войскі Лю Гуй-дана рушыліся ў напрамку Шунсі і разграбілі па дарозе горад Гаолін.

### „СССР ПЕРАТВОРЫЦЦА У ГІГАНЦКУЮ ІНДУСТРЫЯЛЬНУЮ ДЗЯРЖАВУ"

#### „ВАШЫНГТОН СТАР" АБ ДРУГОЙ ПЯЦІГОДЦЫ

НЮ-ІОРК, 2 студзеня (БЕЛТА).

«Вашынгтон стар» у артыкуле, прысвечаным другой совецкай пяцігодцы, піша:

«Дасягі другой пяцігодкі патрасаюць уражэнне. Дасягненні першай пяцігодкі, аднак, дастатковы, каб надаць пашпану да новага прадпрыемства. Калі другая пяцігодка будзе выкананна толькі прыблізна, дык Совецкі Саюз ператворыцца ў адну з гіганцкіх індустрыяльных дзяржаў света».

Газета адзначае, што другая пяцігодка адкрывае вялізарныя магчымасці для збыта ў СССР амерыканскіх тавараў.

## СОВЕЦКА-ЛАТВІЙСКАЯ ЧЫГУНАЧНАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ

МАСКВА, 2 студзеня. (БЕЛТА).

У Маскве закончыла свае работы чарговая совецка-латвійская чыгуначная канферэнцыя па справах простых совецка-латвійскіх чыгуначных грузавых зносін.

Канферэнцыя пераглядзела згоды, тарыфы, службовыя інструкцыі і разліковыя правілы, устаноўленыя раней для совецка-латвійскіх чыгуначных грузавых зносін.

Прадстаўнікі латвійскіх чыгунак устанавілі паніжаныя транзітныя тарыфы на многія грузы, пераважнымі ў совецка-латвійскіх зносінах (лясныя матэрыялы, валакністыя грузы, жалезо і сталь, машыны, цэгла, прадукты, што хутка псуюцца, фанера, бакоўна, азбест, скуры і т. д.).

Паніжаныя тарыфы распаўсюджваюцца на порты Латвіі і сухапутныя напрамкі да Эстоніі і Польшчы.

Канферэнцыя прыняла таксама ільготныя ўмовы правозу груза на порты Ліепая (Лібава) і Вентспілс (Вінданава).

Па асобных грузах рашэнні канферэнцыі павінны ўступіць у сілу 1-га лютага бягучага года.

Наступную чарговую канферэнцыю па справах совецка-латвійскіх чыгуначных зносін пастаноўлена склікаць 5-га студзеня 1935 г.

Транзітныя тарыфы на Літву па простых совецка-літоўска-германскіх грузавых зносінах будуць разглядзены па асобнай па-за-чарговай канферэнцыі ў лютым.

## ЦКК-РСІ СССР АБ РАБОЦЕ ЗАВОДА „НОЎКА" І БЕЛШКЛАТРЭСТА

МАСКВА, 3 студзеня (БЕЛТА).

Беларускі шкляны завод «Ноўка» выпускае 25 проц. усёй саюзнай прадукцыі лампавага шкла. Дрэннае кіраўніцтва Беларускага шклатрэста, непаваротлівасць і нераспарадчасць самой адміністрацыі завода прывялі да глыбокага выторчага прарыва і недапушчальнага затаварвання.

Завод выканаў праграму ўсяго на 57 проц., дапусціўшы да 22 проц. брака. Побач з гэтым к 1-му снежня 1933 г. на заводзе скапілася каля 160 вагонаў востраэфіцытнага лампавага шкла коштам больш 400 тыс. руб., што складае 2-месячную выпрацоўку.

У рэзультаце гэтага завод адчуваў фінансавыя затрудненні, сістэматычна затрымліваў рабочым выплату зарплаты і запазычыўся соцстраху 130 тыс. руб. Адначасова завод не прыняў рашучых мер да ліквідацыі сваёй дэбіторскай запазычанасці, дасягнуўшай 100 тыс. руб.

ЦКК-РСІ СССР указала Галоўнаму кіраўніцтву шкляной прамысловасці НКЛП СССР на адсутнасць кантроля за адпрузкай прадпрыемствамі гатовай прадукцыі і абавязала Саюзшклафарфаразбыт і Беларускі шклатрэст забяспечыць к 5-му студзеня 1934 г. вывазку з завода «Ноўка» ўсёй гатовай прадукцыі.

Дырэктару завода «Ноўка» і Беларускаму шклатрэсту прапанавана ў найкарацейшы тэрмін зрабіць кардынальны разлік з возчыкамі, заключыць пастаянны дагавор з калгасамі на гужавыя перавозкі і поўнасцю ліквідаваць запазычанасць па зарплаце. К 1-му мая 1934 г. павінен быць закончан рамонт пад'язнога шляха да чыгуначнай лініі.

Галоўнаму кіраўніцтву шкляной прамысловасці НКЛП і Беларускаму шклатрэсту прапанавана ўмацаваць гаспадарчае кіраўніцтва завода.

ЦКК-РСІ СССР звярнула ўвагу ЦК КП(б)Б на адсутнасць з боку Суражскага райкома партыі канкрэтна та кіраўніцтва буйнейшым у раёне заводам «Ноўка» і неабходнасць тэрміновага ўмацавання партыйнага і прафсаюзнага кіраўніцтва завода.

Дырэктар Беларускага шклатрэста тав. Кроль А. Г. папярэджан, што ён будзе знят з работы, калі ў першым квартале 1934 г. не даб'ецца сурёзнага колькаснага і асаблівага якаснага паляпшэння ў рабоце падпарадкаваных прадпрыемстваў.

## ПАМЯЦІ А. В. ЛУНАЧАРСКАГА

МАСКВА, 2 студзеня (БЕЛТА).

1-га студзеня пасля крэмацыі урна з прахам А. В. Луначарскага была перавезена назад у Калонную залу Дома саюзаў.

З раніцы другога студзеня быў адноўлен доступ к праху. Зноў, як напярэдадні, бесперапынная істужкай праходзяць тысячы працоўных чырвонай сталіцы, прышоўшых аддаць апошні доўг старому рэвалюцыянеру большэвіку, аднаму з папулярнейшых і любімейшых аратараў.

Адна за другой прыбываюць дэлегацыі маскоўскіх прадпрыемстваў і ўстаноў. Ганаровую варту на працягу дня неслі члены ўрада, старыя большэвікі, работнікі ЦВК СССР і ВЦВК, Народнага камісарыята замежных спраў, Наркамасветы, інсты тута чырвонай прафесуры, Комакадэміі, пісьменнікі, артысты і мастакі.

У 2 гадзіны 15 мінут т.т. Літвінаў, Кіселёў, Бубноў, Крэсцінскі, Булганін, Вышынскі, Семашка, Фелікс Кон бяруць на рукі чырвоныя насілкі з урнай і ціха пад гукі жалобнага марша выносяць на вуліцу.

За урнай следуе сям'я пакойнага, члены ўрада, старыя большэвікі, прыяцелі Анатолія Васільевіча, вучоныя, пісьменнікі, артысты і інш.

Жалобная працэсія суправаджаемая ганаровым ваенным экскортам, накіроўваецца праз Пляц Рэвалюцыі на Чырвоны пляц. Па ўсёй дарозе працэсія ад калоннай залы да маўзалея Леніна і да самога Чырвонага пляца суцэльны масіў людзей, дэлегацый ад маскоўскіх заводаў, фабрык, устаноў, ВНУ, школ і т. д.

Л'юцца гукі жалобнага марша, які выконваецца некалькімі аркестрамі. Працэсія спыняецца каля маўзалея, і урна з прахам А. В. Луначарскага ставіцца на спецыяльны пастамент. На трыбуну маўзалея Леніна падымаюцца т. т. Молатаў, Кагановіч, Калінін, Літвінаў, Бубноў, Енукідзе, Кіселёў, Крэсцінскі, Семашка, Булганін і інш.

Старшыня камісіі па пахаванню тав. Кіселёў адкрывае жалобны мітынг, прысвечаны памяці Анатолія Васільевіча Луначарскага, і прадастаўляе слова А. С. Бубнову, які выступае ад імя ЦК ВКП(б) і саюзнага ўрада.

### ПРАМОВА А. С. БУБНОВА

— У асобе Анатолія Васільевіча Луначарскага, — гаворыць тав. Бубноў, — Совецкі Саюз, рабочы клас, партыя і суседнія комуністычныя сілы страцілі старога заслужанага рэвалюцыянера, большэвіка, віднейшага будаўніка совецкай сацыялістычнай культуры.

Анатолі Васільевіч прышоў у нашу ленінскую партыю пасля другога з'езда партыі і, дзякуючы свайму вялізарнаму таленту і вялікай эрудыцыі ў самых рознастайных галінах чалавечых ведаў, увайшоў у рады большэвіцкай гвардыі, у бліскучую плеяду партыйных публіцыстаў і аратараў таго часу. Свой талант, свае веды, свой тэмперамент барацьбіта-рэвалюцыянера ён цалкам аддаў справе пролетарскай рэвалюцыі.

У гады 1904-1905 А. В. выконваў па заданню партыі рад важнейшых даручэнняў: на трэцім з'ездзе партыі ён робіць даклад аб узброеным паўстанні. На IV Стакгольмскім з'ездзе партыі ён сваёй бліскучай дасціпнасцю рэзка бічуе меншавікоў. Усёй сваёй дзейнасцю барацьбіта-рэвалюцыянера тав. Луначарскі даказаў, што яму дарога партыя, якая нясе наперад сцяг Леніна, і дзесяткі раз ён пацвердзіў сваю адданасць справе пролетарскай рэвалюцыі.

На ўсіх пастах, займаемых ім пасля слаўнай Окцябрскай перамогі, тав. Луначарскі таксама аддана змагаўся за лінію партыі, за перамогу сацыялізма.

Тав. Луначарскі быў прыводным пасам ад партыі да мастацкай інтэлігенцыі. Гэту сваю выдатную работу ён пачаў задоўга да рэвалюцыі і прадоўжыў яе на пасту наркома асветы.

Ён здолеў прыцягнуць да ўдзела ў стварэнні совецкай сацыялістычнай культуры лепшую частку мастацкай інтэлігенцыі, пісьменнікаў, дзеячоў мастацтва, прыцягваючы таксама прыяцеляў пролетарскай рэвалюцыі з асяродзішча левай рэвалюцыйнай інтэлігенцыі Захада.

Усю сваю аграмадную асвету, усе свае веды буйнага вучонага, знаўцы мастацтва ён з энтузіязмам аддаваў будаўніцтву сацыялістычнай культуры.

Анатолі Васільевіч ушоў ад нас у росквіце сваіх сіл, у эпоху, калі рабочы клас і партыя пад кіраўніцтвам вялікага Сталіна падымаюць будаўніцтва сацыялізма ў краіне Советаў на найвялікшую вышыню.

Урна з яго прахам будзе пакоіцца на Чырвоным пляцы, але яго імя заўсёды будзе жыць у памяці барацьбітоў пролетарскай рэвалюцыі.

Ад імя Усесаюзнай Акадэміі Навук гаворыць неадменны сакратар акадэмік Волгін.

Слова прадастаўляецца народнаму камісару па замежных справах тав. **М. М. ЛІТВІНАВУ.**

—Да сваіх выключных заслуг— гаворыць ён, — Анатолі Васільевіч у апошнія гады дадаў яшчэ адну: ён прыняў удзел у той справе, якой партыя і совецкі ўрад надаюць выключнае значэнне ў барацьбе за мір, разам са мной ён прымаў удзел у канферэнцыях па раззбраенню, выступаючы на іх з бліскучымі выкрываннем ворагаў міра. Што-б ні рабіў Анатолі Васільевіч, якое-б даручэнне не выконваў, ён гэта рабіў заўсёды даравіта, бліскуча, талантліва.

А. В. будзе жыць не толькі ў нашай памяці, але і ў нашых сэрцах.

Ад імя Наркамасветы выступіў тав. **ФЕЛІКС КОН.**

— Анатолію Васільевічу была даручана самая адказная работа — падрыхтоўка будучых кадраў. Тое маладое пакаленне, якое атрымала асвету ў школах, кіруемых А. В., з'яўляецца лепшым і вялікім помнікам яго дзейнасці.

Сакратар МК ВКП(б) тав. **Гей** указвае, што маскоўскія рабочыя ведаюць Анатолія Васільевіча Луначарскага не толькі як кіраўніка справы асветы, але знаюць яго як бліскучага аратара, прапагандыста, агітатара, які не адзін раз выступаў на рабочых сходах. Яго жыццё было жыццём рэвалюцыянера, большэвіка, бліскучага вучонага, цалкам пры свяціўшага свае сілы рэвалюцыі.

Жалобны мітынг скончан. Пад гукі жалобнага марша т.т. Молатаў, Кагановіч, Калінін, Енукідзе, Кіселёў, Бубноў, Крэсцінскі, Булганін, Семашка і Вышынскі падымаюць урну і нясуць яе да крэмлёўскай сцяны.

У 3 гадзіны 20 мінут са сцен Крэмля раздаецца трохразовы залп. Урна замуроўваецца ў крэмлёўскай сцяне. Справа ад маўзалея Леніна з'яўляецца дошка: «Анатолі Васільевіч Луначарскі. 1875-1933 г.».

## „СВЯТЫЯ" ЖУЛІКІ

### Справа аб здзеках з расфакаўкі Шнейдер

На працягу двух дзён—31 снежня і 1 студзеня—пролетарскі суд разглядаў справу «святых» жулікаў і вымагатальнікаў з ярэйскіх магілак. І невыцілазова, што зала клуба друкароў была ўвесь час перапоўнена, працэс выклікаў вялікую зацікаўленасць з боку шырокай пролетарскай грамадзкасці.

Справа слухалася пад старшынствам народнага судзьдзі т. Менска т. **ГУРВІЧА** пры народных засядацелях т. т. **АФАНАСЬЕВА і ЛЕЛЬЧУКУ.** Абвінавачанне падтрымлівалі пракурор Наркамюста т. **ЗАХАРЫН** і грамадскі абвінаваўца—прадстаўнік рэдакцыі «Звязды» т. **А. ЛЕВІН.** Абараняў падсудных член калегіі абаронцаў т. **ЛЕВІН Б.**

Цэнтральная фігура працэса—прадстаўнік яўрэйскай рэлігійнай абшчыны **БОРУХ РАКАЎШЧЫК.**

Хто такі Ракаўшчык? Гэта чалавек, які ўсё сваё жыццё толькі і займаўся тым, што апутваў працоўных сецямі рэлігіі і клаў сабе ў кішэню вымаганыя грошы. Меламедцёмнага хедэра, «шамес» сінагогі, прадстаўнік рэлігійнай абшчыны на могілках—вось, так сказаць, «паслужны спіс» Ракаўшчыка. Абіраць людзей, пакланяцца і рабалепнічаць перад багатымі, здзекавацца з працоўных — гэта яго прафесія.

І таму, калі ён з снежня ўбачыў на могілках плачучую маладую дзяўчыну Шнейдэр, перпяя яго мыкчь была: «Ці мае яна грошы, колькі можна ў яе вырваць».

— Чаго ты плачаш, дзіця маё? Пазваць матку? Дай мне, дзіця маё, ордэр ЗАГС'а, вось так. Дай свой дакумант. Так...(Так. А цяпер, дзіця маё, плаці 35 руб., тады пахаваем тваю матку.

—Я-ж ужо заплаціла ў ЗАГС'е 38 руб За што-ж яшчэ плаціць? У мяне няма больш грошай.

—Тут роля ЗАГС'а скончана Гаспадар могілак—рэлігійная абшчына, без грошай нічога не будзе.

Ракаўшчык добра ведае, што Шнейдэр заплаціла за пахаванне ў ЗАГС, што яна—студэнтка рабфака—не хоча ніякага рэлігійнага абрада, але яму трэба вырваць грошы, трэба выслужыцца перад абшчынай і ён нічога не гаворыць нявопытнай Шнейдэр, утойвае, што просіць грошы за выкананне рэлігійнага абраса. Не маючы ніякага права адбіраць ордэры ЗАГС'а, а тым больш патрабаваць асабістыя дакументы, ён прысвойвае сабе гэтыя функцыі, выдае сябе за гаспадара могілак. Такава дырэктыва абшчыны—не спыняцца перад металамі, перахватваць як мага больш ордэроў і браць як мага больш грошай.

Паразіты з абшчыны ведаюць і выкарыстоўваюць псіхалогію забітых горам сваякоў памёршых, якія ў гэтыя мінуты не лічацца ні з чым і лёгка трапляюць на вудачку «святых» жулікаў. Гэта-ж факт, што Ракаўшчык і абшчына бяруць ад 50 да 300 руб. за ...малітву над магілай памёршага. Мала таго, Ракаўшчык урывае яшчэ кожны раз па 50 да 300 руб. за... малітву над мамадпісам імя нябожчыка. Усё гэта робіцца, аразумела, у імя «супакаення душы» памёршага.

Ракаўшчык і не імкнуўся апраўдваць дзейнасць абшчыны. З цынічнай адкрытасцю, пад рогат усёй залы ён гаворыць аб сапраўдных «ідэях» гэтых «прадстаўнікоў бога»:

—Зразумела, талоўнае—гэта грошы. Рэлігія—гэта таксама грошы. Заплацілі нам як след, мы і хаваем, не заплацілі—няхай сабе ляжыць нябожчык хоць тыдзень, мы-ж не вынаваты, што ён бедны.

І на запытанне грамадзкага абвінаваўца, як-жа ён, рэлігійны чалавек, вытлачыў, што згодна рэлігійнага закона нельга пакідаць нябожчыка непахаваным на цэлую ноч, Ракаўшчык, не задумваючыся, адказвае:

— Якая мне справа да закона, раз мне прошай не заплацілі. Я без грошай хаваць не магу, бо абшчына мяне за гэта звольніць.

Грошай, пабольш грошай!—такі алтынны дэвіз абшчыны, і яна ажыццяўляе гэты дэвіз за кошт працоўных, якіх ёй удаецца ашукаць. І Ракаўшчык наўчна скарэдзіцца, што чым сялей, тым менш «кліентаў» становіцца ў абшчыны, рабочыя цяпер не хочуць хаваць па-рэлігійнаму і нашы заработкі ўсё больш па даюць».

Але на яўрэйскіх могілках ёсць не толькі Ракаўшчык. Ёсць работнікі ЗАГС'а, якія з'яўляцца (правільней, павінны з'яўляцца) сапраўднымі гаспадарамі могілак. Гэтыя работнікі—Жывіца і Анцыперовіч—сядзяць цяпер побач з Ракаўшчыкам на лаве падсудных.

Яны падпалі поўнасцю пад уплыў абшчыны, пад уплыў Ракаўшчыка і фактычна дзейнічаюць разам з імі.

Невыпадкова-ж ордэры ЗАГС'а, якія павінны пападаць да Жывіцы, пападаюць да Ракаўшчыка. Жывіца ўпэўнен, што ад гэтага і ён тое-сёе атрымае.

Невыпадкова, калі патрэбна абшчыне і Жывіца, і Анцыперовіч заўсёды гатовы ёй дапамагчы. Ракаўшчык у любы час можа разлічваць на загсаўскі катафалк, на загсаўскія дошкі і т. д. і той, хто прыходзіць на могілкі, школі не можа разабрацца, дзе канчаецца ЗАГС і дзе пачынаецца рэлігійная абшчына. Хоць фармальна могілкі належаць гарсавету, ЗАГС'у, на справе імі распаўпараджаецца абшчына.

Жывіца і Анцыперовіч дзейнічаюць такім-жа металам, як і Ракаўшчык: «без грошай нічога не выйдзе». Тое, што за пахаванне плацяць у ЗАГС'е, зусім не перашкаджае ім яшчэ раз патрабаваць грошы за кожную дробязь. «Заплоціш грошы—дапамагу вынесці нябожчыцу на катафалк, не заплоціш—цягні сама». «На катафалк сесці побач са мной не пушчу, бо ты мне давай на папіросы не дала, можаш ісці пехатою»,—так здзекваўся Анцыперовіч са Шнейдэр.

Цэлыя суткі Жывіца ўпарта не жадаў капаць магілу для маткі Шнейдэр, ён рашуча адмаўляўся дапамагчы апусціць труп у магілу. Усё гэта таму, што ў Шнейдэр не было грошай каб заплаціць бяздушным рвачам.

А тут на суме Жывіца і Анцыперовіч робяць найўны выгляд. Яны моў, не ведаюць, за што іх прыцягваюць да адказнасці. «Што-ж тут дрэннага, калі я прасіў на папіросы,—здзіўляецца Анцыперовіч.—

Гэта-ж зусім нармальнае з'явішча».

І зусім правільна пракурор і грамадскі абвінаваўца адзначылі вялікую віну ЗАГС'а за ўсе абуры ныя непаразлікі на могілках, за здзекі з Шнейдэр і інш.

Суд дапытаў у якасці сведкі загатыка ЗАГС'ам т. Бодака, але той нічога не мог прывесці ў апраўданне ЗАГС'а. Яго паказанні—гэта абвінавачэнні акт самому кіраўніцтву ЗАГС'а, якое страціла класавую пільнасць, фактычна поўнасцю перадаўшы яўрэйскія могілкі ў распараджэнне «хэўра-кадыша».

Сам т. Бодак аказаўся бездапаможным, калі Шнейдэр прышла да яго са скаргай на Жывіцу і Ракаўшчыка. Замест прымяцення рашучых мер, на ордэры Шнейдэр ён пішэ разлюцыю: «Тав. Жывіца, трэба прыняць захады, каб як-небудзь пахаваць і абыйсці гэту хэўру».

І так загадчык ЗАГС'ам не знаходзіць іншых метадаў барацьбы з хэўрай, як толькі метадаў абыходжання яе, упрошвання Жывіцы пахаваць нябожчыцу.

Прадстаўнік рэдакцыі «Звязды» тав. Левін у сваім выступленні адзначыў таксама недапушчальную працу ня чуласць, якую праявілі ў адносінах да рабфакаўкі Шнейдэр студэнцкія арганізацыі і дэканат рабфака.

***

12 гадзін ночы, пасля паўтарагадзіннай нарады, суд вынес наступны прыгавор:

Ракаўшчыка падвергнуць прымусовым працам тэрмінам на 1 год. Але ўлічваючы яго стараць, замяніць яму прымусовыя працы штрафам у суме 500 руб. Паставіць пытанне перад гарсоветам аб пазбаўленні яго выбарчых правоў.

Жывіцу—да 6 месяцаў, Анцыперовіча—да 4 месяцаў прымусовай працы.

У прыватным апраўданні суд паставіў давесці да ведама гарсовета аб недапушчальна дробнай работы ЗАГС'а, які зусім не ціквівіцца становішчам могілак.

С. Галкін

Адказны рэдактар Г. Н. БРАГІНСКІ.


КІНО-ТЭАТР «ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА» — Замежны мастацкі фільм **Лакоажа дыядэмы** У фінале — 1 анізотнае адзял

КІНО Пролетарый — Рычард Толмедж у фільме **Лоўкіз дзельцы** трукавая камедыя ў 6 част

КІНО Інтэрнацыянал — Мастацкі замежны фільм **КАПІТАН ДУНКАН**

КІНО СПАРТАК — Замежны мастацкі фільм **Двуногія шакалы** Драма ў 6 частках

**ДЗІЦЯЧЫ-ГУКАВЫ Кіно-тэатр**

**Сёння і штодзенна**

МАСТАЦКІ ФІЛЬМ

**ЮДА**

у 8 частках

УПРАГРАМЕ **Гукавая хроніка.**

Пачатак сеансаў **11, 1, 3, 5, 7** гадз. Наведванне кіно школамі праходзіць выключна па плану Гарана.

Цана білетаў—**20** кап.

**МЕНДЗЯРЖКІНО**

даводзіць да ведама арганізацый, маючых **КІНО ХАТКІ ПІОНЕРАЎ**, што з 5 І. 1934 г. **перад ключаюцца Дагаворы на пракат кіно-фільм на 1934 г.** Арганізацыям, не заключыўшым умову да 20. І., фільмы адпускацца не будуць. Дагаворы заключаюцца з 10 гадзін раніцы да 2-х гадзін дня кожны дзень. Мендзяржкіно, Совецкая 90.

**САДОВА-ГАРОДНІ ІНСТЫТУТ**

АБ'ЯВЯЛЕ

**ЗІМОВЫ НАБОР** *студэнтаў*

на 1 КУРС на адзяленні **садавода і гароднікаводства.**

*Тэрмін* навучання—4 гады і 4 месяцы.

**Прыём заяў** да 15-І—34 г. Іспыты праводзяцца з 15 па 20 студзеня. Заняткі пачынаюцца з 1 лютага.

Да заяў прыкладаюцца: 1) Засведчаная анкета; 2) дакумант аб асвеце (арыгінал); 3) аб ўзросце; 4) аб адносінах да вайсковай службы; 5) аб соцыяльным паходжанні і матэрыяльным становішчы; 6) 2 фота-карткі.

Студэнты забяспечваюцца інтэрнатамі, стыпендыямі ад 70 да 115 руб. (а паспяховасці), абедамі, гарачымі снеданнямі і начэрамі коштам да 1 рубля ў дзень і 600 грам хлеба, апрача сталовай.

Адрас: Менск, Лошыца 1-я, садова-гародні інстытут.

**Дырэктар інстытута ЛАГУЧЕНКА.**

**ЖУРЫ ПА КОНКУРСУ НА ЛЕПШЫ ЛІТАРАТУРНЫ МАСТАЦКІ ТВОР ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ**

**ПАВЕДАМЛЯЕ,**

ШТО **АПОШНІ ТЭРМІН**

**падачы твораў** на конкурс

**10 студзеня 1934 года**

**Творы** прысылаць **у НКАсветы** з ініцыям **„на конкурс"** або юн дзетсектару ДБВ.

**Журы.**

**ВЫДАВЕЦТВУ „ЗВЯЗДА"**

**ПАТРЭБЕН** ТЭХНІЧНЫ САКРАТАР

Зварачацца: Совецкая, 63 2-гі паверх.


## ПАСТАНОВА

### Прэзідыума ЦСПСБ і калегіі НКА БССР ад 21 снежня 1933 г.

Улічваючы, што недахоп настаўнікаў зрывае паспяховае правядзенне ўсеагульнага абавязковага навучання і забеспячэнне поўнага выканання гістарычнай пастановы партыі аб школе,—Прэзідыум ЦСПСБ і Калегія НКА БССР на падставе пастановы СНК БССР ад 27 лістапада 1930 г.—**ПАСТАНАЎЛЯЮЦЬ:**

1. Абавязаць усіх кіраўнікоў прадпрыемстваў, устаноў і арганізацый на працягу 5 дзён склаціі спісы на ўсіх асоб, якія прававалі раней на настаўніцкай рабоце, а таксама і тых, якія маюць спецыяльную педагагічную асвету, і накіраваць гэтыя спісы ў НКАсветы.

2. Асобы, якія будуць НКАсветы прызнаны годнымі для педагагічнай работы, павінны быць у 3-хдзённы тэрмін аслабнены ад работы і накіраваны ў распараджэнне НКАсветы для прызначэння іх на педагагічную работу па спецыяльнасці.

3. Абавязаць старшынь ФЗМК прыняць актыўны ўдзел ў выяўленні (ў абслугоўваемых імі ўстановах) ўсіх настаўнікаў, якія працуюць не па спецыяльнасці, і неадкладна знаць іх з прафсаюзнага ўліку.

Папярэдзіць усіх кіраўнікоў устаноў і прадпрыемстваў, што прыём на работу асоб, якія маюць педагагічную асвету, адбываецца выключна са згоды органаў НКА асветы.

За парушэнне гэтага вінаватыя, як кіраўнікі ўстаноў, так і асобы, якія самавольна кідаюць педагагічную працу або па скавчанні педагагічных навучальных устаноў не працуюць па сваёй спецыяльнасці—будуць прыцягнуты да адказнасці.

Сакратар ЦСПСБ **ЛІСКОВІЧ.**
Нарком Асветы БССР **ЧЭРНУШЭВІЧ.**


У сувязі з дапушчанымі пратэрміноўкамі пазык і неаплаты рахункаў,

**ПОЛАЦКАЕ АДДЗЯЛЕННЕ ДЗЯРЖБАНКА ПРАДАЕ** *НАСТУПНЫЯ ТАВАРЫ:*

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| 1. Віно ягаднае | 25.000 літраў | на | 150 000 р. | Плодаягадн. з-да |
| 2. Цеста журавіннае | 50 тон | „ | 116.000 р. | „ „ „ |
| 3. Сані | 25 шт. | „ | 1750 р. | арцель „Парыж. комуна" „ |
| 4. Кілісы | 35 шт. | „ | 1750 р. | „ „ „ |
| 5. Бочкі | 100 шт. | „ | 715 р. | „ „ „ |
| 6. Тарныя доскі | 50 к-м | „ | 2000 р. | „ „ „ |
| 7. Фанера | 500 ліст. | „ | 1000 р. | „ „ „ |
| 8. Абзацы | 241 стан. | „ | 2316 р. | „ „ „ |
| 9. Хады вараконныя | 378 штук | „ | 75385 р. | Белсельгасспаб |
| 10. Пас прагумованы | 128. 4 м. | „ | 1.760 р. | „ |

**Полацкае аддзяленне дзяржбанка.**

**Сектар Кнігагандля Дзяржаўнага Выдавецтва Беларусі**

(гор. Менск, Пляц Волі, 5).

*ВЫШАЎ з ДРУКУ,*

**ПАСТУПІЎ У ПРОДАЖ**

**І рассылаецца на месцы**

**НАСЦЕННЫ ШТОДЗЕННЫ АДРЫЎНЫ КАЛЕНДАР НА 1934 г.**

У змесце календара шмат матэрыялаў паасобных пытаннях сельскай гаспадаркі, а таксама багаты матэрыял па соцбудаўніцтву СССР і БССР і інш. неабходныя календарныя весткі.

*Цана* КАЛЕНДАРА **1 р. 20 кап.**

З мастацкай сценкай (фотапартрэты правядыроў), **Ц. 1 р. 45 к.**

**ПАТРАБУЙЦЕ** ВА ЎСІХ КНІГАРНЯХ І КІЁСКАХ ДВБ. БАКТ'а. РАЙСПАЖЫЎСАЮЗАЎ І САЮЗДРУКА.

**ВЫДАВЕЦТВА „ЗВЯЗДА"** *ЗАПРАШАЕ* **на работу**

**ГАЛОЎНАГА БУХГАЛТАРА.**

Для перагавораў зварачацца да загадчыка выдавецтва (Совецкая 63, 2 паверх).


Нарсуд жыхамеры гор. Менска абвяшчае грамадзкае ганьбаванне гр. **Вольф Вольфе Александэравіч** заг. сгаловай № 11, згодна прыгавора суда ад 13-XII—33 г. па арт. 196 К. К.

Нарсуд 2-га уч. гор. Менска абвяшчае грамадзкае ганьбаванне гр. **Дзвэ Землі Андрэю Даніловіч**, жыхару па вул. Чырвонай, 21-І, згодна прыгавора суда ад 27-XI—33 г. па справе па абвінавачанню яго па 223 арт. К. К.

Менск, друкарня «Звязды» Упаўнаважаны Галоўлітбела «К»2308